БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

Аб’ект аўтарскага права
УДК 398(=161.3)(043.3)+398.85:355(=161.3)(043.3)

**ШЭЙБАК**
НАСТАССЯ АНАТОЛЬЕЎНА

# БЕЛАРУСКІ ВАЕННЫ ФАЛЬКЛОР XX СТ.: ЭВАЛЮЦЫЯ, МІФАСЕМАНТЫКА, СПЕЦЫФІКА МАСТАЦКАГА ДЫСКУРСУ

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
доктара філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.09 – фалькларыстыка

Мінск, 2025

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

**Навуковы кансультант** — **Казакова Ірына Валер'еўна**, доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Афіцыйныя апаненты** — **Валодзіна Таццяна Васільеўна**, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў філіяла «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы» ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі»

**Голубеў Валянцін Фёдаравіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык Цэнтра гісторыі Беларусі IX–XVIII стст. і спецыяльных гістарычных навук ДНУ «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

**Трацця к Зоя Іванаўна**, доктар філалагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»

**Апаніруючая арганізацыя** — УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна»

Абарона адбудзецца 30 мая 2025 года ў 12.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62; тэл. вучонага сакратара: 209-55-58).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Аўтарэферат разасланы 22 красавіка 2025 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый — Т. П. Сідарава

# УВОДЗІНЫ

Ваенны фальклор – унікальная духоўная спадчына беларускага народа, мастацкае адлюстраванне калектыўнага і індывідуальнага вопыту пражывання падзей этнічнай гісторыі. Пачынальнікі навуковага даследавання гэтай тэмы М. Грынблат, Л. Бараг, М. Меяровіч, Л. Мухарынская, Г. Цітовіч, Р. Шырма, І. Гутараў, А. Фядосік, Г. Барташэвіч і іншыя адзначалі, што фальклор ваеннага часу мае вялікае культурнае значэнне як «своеасаблівы гістарычны дакумент» і «мастацкі летапіс жыцця народа». Фальклор з'яўляецца змястоўнай, але пры гэтым вельмі спецыфічнай крыніцай па гісторыі вайны, таму што фіксуе не падзейны, фактычны яе бок, а ў першую чаргу вопыт, засвоены эмацыянальна. Фальклорныя адзінкі адлюстроўваюць асноўныя культурныя архетыпы і стэрэатыпы, уласцівыя масавай свядомасці. Яны знаходзяць сваё выражэнне ў міфапаэтычнай структуры вуснай народнай традыцыі, перадаючы калектыўны досвед і светапогляд праз вобразы і сімвалы.

Вусна-паэтычныя тэксты ва ўсёй іх разнастайнасці, а таксама комплекс уяўленняў і засцерагальных практык, якія кадзіруюць вайну ў карціне свету беларусаў, з'яўляюцца аб'ектам навуковага вывучэння ў розных ракурсах фалькларыстыкі, антрапалогіі, сацыялогіі і культуралогіі. Сёння фарміруюцца новыя палі гуманітарных ведаў пра Вялікую Айчынную вайну, якія развіваюцца ў даследчых праектах, прысвечаных вуснай гісторыі, ваеннай антрапалогіі, гісторыі штодзённасці, палітыцы мемарыялізацыі.

Пры ўсёй запатрабаванасці гістарычнай і культурнай спадчыны вайны і вялікім значэнні, якое справядліва надаецца гэтай тэме ў сучасным беларускім грамадстве, ваенны фальклор застаецца недастаткова даследаваным культурным феноменам па некалькіх прычынах. Па-першае, з-за маштабу і шматмернасці самой з'явы. Спецыфіка народнай творчасці ваеннага часу заключаецца ў тым, што яна ўзнікла як складаная дынамічная сістэма, абумоўленая ўзаемадзеяннем розных відаў масавай мастацкай творчасці. Так, на адным полюсе гэтага культурнага кода знаходзіліся ўвасобленыя пераважна ў песенных і вершаваных формах узоры савецкай масавай культуры і іх шматлікія пералажэнні. Другі полюс, у цэнтры якога была так званая «старая салдацкая песня», рэпрэзентуюць творы класічных жанраў і розныя пераходныя жанрава-тэматычныя з'явы. Такі ўнікальны па сваёй сацыяльна-культурнай прыродзе кангламерат эфектыўна выконваў не толькі мастацкія, але і пазамастацкія функцыі, выступаючы сімвалам ідэнтычнасці, рэпрэзентацыі групавой салідарнасці, сацыяльным рэгулятывам, формай камунікацыі, прапаганды і інш., таму ў навукова-тэарэтычным сэнсе яго значэнне лічылася даказаным. Другой прычынай пэўнай інерцыі ў вывучэнні

беларускага ваеннага фальклору была ўлучанасць навукоўцаў савецкага часу ў нарматыўную сацыяльную парадыгму, іх ідэйная заангажаванасць, якая прымушала многіх прымяняць селектыўныя падыходы ў збіральніцкай і эдыцыйнай практыках, метадах інтэрпрэтацыі з'яў і высновах.

Ва ўсходнеславянскай фалькларыстыцы ваенны фальклор даследаваны дастаткова глыбока, пра што сведчаць навуковыя працы К. Чыстова, Р. Кырчава, В. Гусева, А. Кузьменкі, С. Строганава, У. Гнацюка, І. Беразоўскага, Г. Грынчанкі, Т. Нікольчанкі, Я. Гудошнікава, Г. Язона, В. Бяловай, Ж. Карміной і інш. У айчыннай навуцы аб народнай творчасці работы падагульняючага і комплекснага характару ў названым кірунку яшчэ не прадстаўлены.

**Актуальнасць** дысертацыйнага даследавання вызначаецца:

1) запатрабаванасцю цэласнай, заснаванай на прынцыпах гістарызму карціны збірання і вывучэння беларускага ваеннага фальклору ў XX ст., якая ўзбагаціць гісторыю развіцця нацыянальнай гуманітарыстыкі;

2) неабходнасцю комплекснага асэнсавання беларускага ваеннага фальклору як унікальнай складовай часткі вусна-паэтычнай спадчыны беларусаў, пераадольвання звужанага падыходу ў навуцы, які грунтаваўся на прынцыпах сацыялістычнага рэалізму і ігнараваў шэраг з'яў народнай творчасці;

3) важнасцю выпрацоўкі новых дэфініцый і тэарэтыка-метадалагічных падыходаў для прэзентацыі ў сучасным навуковым дыскурсе вуснай народнай творчасці беларусаў, абумоўленай ваеннымі падзеямі XX ст. і іх уплывам на лёс беларусаў;

4) неабходнасцю актуалізацыі фальклорнай спадчыны беларусаў пра вайну як прыклад патрыятычнай любові да Радзімы, ушанавання народнага подзвігу і адстойвання ідэй гуманізму.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі, тэмамі**

Дысертацыйная работа выконвалася ў рамках наступных навуковых тэм кафедры гісторыі беларускай літаратуры БДУ: «Беларуская літаратура XI–XIX стст. у міжкультурнай камунікацыі еўрапейскіх літаратур» (2016–2020 гг.; дзяржрэгістрацыя № 20162486); «Беларуская літаратура XI–XXI стст.: станаўленне і эвалюцыя жанраў» (2021–2025 гг.; дзяржрэгістрацыя № 20212928) падпраграмы «Беларуская мова і літаратура» ДПНД «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства».

**Мэта і задачы даследавання**

**Мэта** даследавання – вызначэнне сацыяльна-гістарычнай прыроды і ідэйна-мастацкага зместу беларускага ваеннага фальклору ХХ ст.

Для дасягнення заяўленай мэты неабходна вырашыць наступныя **задачы:**

1) апісаць гісторыю вывучэння беларускага ваеннага фальклору ХХ ст.; выявіць фактары, якія фарміравалі даследчае поле і ўплывалі на навуковыя трактоўкі, збіральніцкую і эдыцыйную практыкі;

2) ахарактарызаваць створаны ў навуцы і культурнай практыцы 1940–1960-х гг. канон беларускага ваеннага фальклору; асэнсаваць уплыў метаду сацыялістычнага рэалізму на развіццё навукі аб народнай творчасці;

3) даць азначэнне, раскрыць вытокі, эвалюцыю і жанравую спецыфіку беларускай народнай ваеннай песні; на матэрыяле найбольш рэпрэзентатыўных твораў апісаць працэс фальклярызацыі;

4) даказаць тэкстуалізацыю эпічнага сюжэта з героем – народным заступнікам у гістарычных паданнях пра партызанскага камандзіра К. Заслонава (на матэрыялах фальклорных экспедыцый Л. Барага і М. Меяровіч 1943, 1945–1946 гг.);

5) асэнсаваць уплыў культуры салдацкага асяроддзя (войскі Расійскай імперыі ў беларускіх губернях) на абрадавую традыцыю і народную драму беларусаў у другой палове ХІХ – пачатку ХХ ст.;

6) раскрыць міфасемантыку ваеннага фальклору, увасобленую ў народных песнях, рэлігійна-містычных уяўленнях і засцерагальных практыках;

7) канцэптуалізаваць ваенны фальклор як мастацкі дыскурс; вызначыць традыцыйныя і новыя дыскурсаўтваральныя канцэпты.

**Аб’ект і прадмет даследавання**

У адпаведнасці з пастаўленай мэтай і задачамі **аб’ект** даследавання – тэксты беларускага ваеннага фальклору, зафіксаваныя ў фальклорна-этнаграфічных экспедыцыях АН БССР 1930–1960-х гг. і апублікаваныя ў навуковых выданнях; дакументы асабістага і афіцыйнага паходжання 1940–1970-х гг., якія ўтрымліваюць інфармацыю пра бытаванне, збіранне і інтэрпрэтацыі адзначаных узораў народнай творчасці.

**Прадмет** даследавання – семантыка і жанравая спецыфіка славесных, славесна-музычных і абрадавых тэкстаў ваеннага фальклору ў наступных ракурсах: гісторыя вывучэння і канцэптуалізацыя; эвалюцыя як вынік узаемадзеяння розных этнічных традыцый і тыпаў культуры; дыскурсіўныя параметры.

**Навуковая навізна дысертацыі** заключаецца ў тым, што ў беларускай фалькларыстыцы **ўпершыню:**

1. Узнята праблема генезісу і мастацкай прыроды ваеннага фальклору ХХ ст. як часткі вусна-паэтычнай спадчыны беларусаў, выяўлення ў ім суадносін традыцыйнай, афіцыйнай і масавай культуры.

2. Вызначаны этапы вывучэння ваеннага фальклору ў ХХ ст. з улікам гістарычных, сацыякультурных і ідэалагічных фактараў уплыву; даецца аб'ектыўная ацэнка дзейнасці ўстаноў, акадэмічных калектываў і асобных даследчыкаў (Л. Барага, М. Грынблата, М. Меяровіч) па фарміраванні нацыянальнага фонду фальклорных матэрыялаў пра вайну.

3. Асэнсавана значэнне метаду сацыялістычнага рэалізму для беларускай фалькларыстыкі 1930–1980-х гг.; паказаны і ахарактарызаваны шырокі культурніцкі рух у БССР па стварэнні народнага сацыялістычнага мастацтва.

4. Пашырана даследчае поле беларускай фалькларыстыкі ў выніку ўвядзення ў навуковы ўжытак аўтэнтычных тэкстаў, якія адлюстроўваюць не артыкуляваную раней у навуковым дыскурсе фальклорную карціну войнаў і вайсковай штодзённасці канца XIX–XX стст.

5. Канцэптуалізаваны з'явы ваеннага фальклору, якія раней заставаліся на перыферыі навуковай рэфлексіі (ваенныя песні ліра-эпічных і рамансавых формаў, гістарычныя паданні, герменеўтычныя формы народнай прозы, засцерагальныя практыкі часоў Вялікай Айчыннай вайны), выяўлена іх міфасемантыка і мастацкая спецыфіка.

6. Даказана толькі абазначаная ў працах савецкіх даследчыкаў (Л. Барага, М. Грынблата) гіпотэза тэкстуалізацыі эпічных матываў на познім этапе развіцця гістарычнага падання, якую рэпрэзентуюць аповеды пра партызанскіх камандзіраў Вялікай Айчыннай вайны.

7. Вылучана гіпотэза ўплыву культуры салдацкага асяроддзя XIX – пачатку ХХ ст. на народную драму і абрадавую традыцыю беларусаў, вынікам чаго стала традыцыя правядзення калядных ігрышчаў – «вайсковых абыходаў» (Цэнтральная Беларусь, зоны беларускага і ўкраінскага Палесся), што дае падставы для ўдакладнення шэрага прынятых у сучаснай навуцы палажэнняў.

**Метады даследавання**

Выкарыстаны комплексны падыход, аснову якога складаюць храналагічны, культурна-гістарычны, гісторыка-генетычны, структурна-семіятычны метады ў спалучэнні з фалькларыстычным, дыскурсіўным і кантэкстуальным аналізам традыцыйнага тэксту.

Метадалагічнай базай дысертацыі служаць тэарэтычныя палажэнні даследчыкаў, якія непасрэдна назіралі і фіксавалі фальклорную традыцыю Вялікай Айчыннай вайны (В. Крупянская, С. Мінц, Л. Бараг, М. Меяровіч, Л. Мухарынская, М. Грынблат, В. Гусеў, К. Чыстоў, А. Сойманаў, І. Гутараў, А. Фядосік, Г. Барташэвіч, Г. Цітовіч, Л. Пушкароў, Н. Камоўская), а таксама працы, прысвечаныя розным галінам нарадазнаўства (У. Проп, У. Чычараў, А. Байбурын, Г. Пятроўская, Т. Валодзіна, В. Лабачэўская, Л. Емяльянаў, А. Кузьменка, І. Зямцоўскі, Т. Кухаронак, Г. Грынчанка, А. Башарын, В. Бялова, А. Сяняўская), заканамернасцям фалькларызацыі тэкстаў пісьмовай музычна-паэтычнай культуры і з'яў вуснай традыцыі (У. Бахцін, Я. Гудошнікаў, С. Няклюдаў, І. Розанаў, М. Строганаў, А. Размахнін, М. Лур'е, Ж. Карміна, М. Раку, С. Адоньева, Н. Герасімава, Б. Ягубаў, В. Пацявін), мастацтву сацыялістычнага рэалізму і рэпрэзентатыўным стратэгіям савецкай культуры (Ф. Мілер, Х. Гюнтар, Я. Дабрэнка, А. Панчанка, К. Багданаў, У. Юстус, К. Кларк, Т. Круглова), мастацтвазнаўчым аспектам фальклорнага тэатра (П. Багатыроў, У. Няфёд, Г. Барышаў, М. Каладзінскі, Г. Някрылава, Н. Савушкіна, Д. Стэльмах), дыскурс-аналізу мастацкага тэксту (Т. ван Дэйк, Ц. Тодараў, Р. Барт, Ю. Прохараў, У. Карасік, Н. Аруцюнава, М. Макараў, Ю. Караулаў, А. Кібрык, Ю. Эмер).

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. На этапе *класічнага нарадазнаўства* (сярэдзіна XIX ст. – 1920-я гг.) апублікаваны знакавыя ўзоры народнай песні пра рэкрутчыну/салдатчыну. Асэнсаваныя ў кантэксце сацыяльна-бытавой лірыкі, яны, аднак, не станавіліся самастойным аб'ектам даследавання. Фактарам адчужэння падобных з'яў ад навуковай парадыгмы канца XIX – пачатку XX ст. з'яўляецца прынятая ў тагачаснай навуцы ацэнка познетрадыцыйнай (новай) песні як чужароднай сялянскай культуры. Факты вуснай народнай традыцыі Першай сусветнай вайны застаюцца ў беларускім нарадазнаўстве неасэнсаванымі. *Савецкі этап* (1930–1980-я гг.) вызначаецца дамінаваннем метаду сацыялістычнага рэалізму ў тэорыі і збіральніцкай практыцы фалькларыстаў. З 1945 па 1962 г. адбыліся фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі беларускіх вучоных і дзеячаў культуры, вынікам якіх стала стварэнне ўнікальнага фонду фальклорных матэрыялаў Вялікай Айчыннай вайны. Іх увядзенне ў навуковы і культурны дыскурс савецкай краіны стрымлівалі наступствы ідэалагічных кампаній 1946–1953 гг. На *постсавецкім этапе* народная творчасць, звязаная з тэмай вайны, практычна не выступае аб'ектам навуковага даследавання і збіральніцкай практыкі. У асобных працах яна разглядаецца ў ракурсах, выпрацаваных у савецкі час, на аснове класічных тэкстаў пераважна песенных жанраў з гісторыка-

публіцыстычным, краязнаўчым і аўтабіяграфічным каментаваннем. Сёння беларускі ваенны фальклор застаецца рэсурсам асэнсавання нацыянальнай этнакультурнай спадчыны, захоўваючы вялікі патэнцыял для наступных пакаленняў айчынных фалькларыстаў.

2. *Канон беларускага ваеннага фальклору* – корпус прадстаўленых у навуковым і культурным дыскурсах савецкай краіны нарматыўных тэкстаў пра вайну, якія рэпрэзентавалі ўсю беларускую народную творчасць адзначанай тэматыкі. Вызначальным фактарам фарміравання канона служыла наяўнасць у творах героіка-патрыятычнага пафасу, узгадванне знакавых падзей і месцаў вядзення баявых дзеянняў, вобразаў савецкай героікі, што дазваляла трактаваць падобныя творы як «дакументы эпохі». Некананічныя народныя творы, якія адлюстроўвалі трагізм сутыкнення чалавека з вайной, у асноўным выключаліся з даследчага поля фалькларыстыкі.

3. *Беларуская народная ваенная песня* разглядаецца як частка беларускай этнакультурнай спадчыны, музычна-паэтычныя тэксты вуснай і пісьмовай формаў бытавання, у якіх вайна адлюстравана як сацыяльна-асобасная падзея, вербалізаваны эмацыянальна-эстэтычны і практычны вопыт вайны ці вайсковай штодзённасці. Адзіная пазажанравая семантыка-камунікатыўная прыкмета ваеннай песні – тэматыка і (ці) бытаванне твора непасрэдна ці ўскосна адносяцца да рэчаіснасці вайны. Вытокі ваеннай песні беларусаў – ва ўстойліва засвоеных запазычаннях з казацкай (з XVI–XVII стст.), рускай рэкруцкай песень і рэпертуару рэгулярнай арміі Расійскай імперыі (XIX ст.). Пад уплывам гістарычных падзей XX ст. адбыліся інтэнсіўныя фальклоратворчыя працэсы, што выразілася ў эвалюцыі раннетрадыцыйных баладных і ліра-эпічных формаў у мадэрнізаваныя формы гарадскога раманса. Спосабам засваення народнай традыцыяй новага мастацкага зместу стала *фалькларызацыя* – уключэнне прафесійных/аўтарскіх твораў у фальклорную культуру, вынікам чаго служыць *launch*

4. У гістарычных паданнях пра партызанскага камандзіра Канстанціна Заслонава (зафіксаваны ў 1943, 1945–1946 гг.) на авантурна-прыгодніцкі сюжэт «Партызанскі камандзір дзейнічае ў нямецкім тыле» тэкстуалізаваны звязаны з вайной 1812 г. эпічны сюжэт «Платаў як невядомы госць француза», які ўзыходзіць да міфалагічных сюжэтаў пра барацьбу героя з пачварамі. Фальклорны вобраз Канстанціна Заслонава («дзядзі Косці») акумулюе ўніверсальную для ваеннага фальклору семантыку «айца-камандзіра» (удалага

малойчыка, народнага заступніка, казацкага атамана), надзяляецца рысамі геройскай адвагі, здольнасцю да тактычнай перамогі над ворагам. Гэта інтэрпрэтуецца як характэрная для перыядаў войнаў і сацыяльных катаклізмаў актуалізацыя ў народнай свядомасці і ў фальклоры архаічных канцэптаў і сюжэтных схем. Фальклорнай персаніфікацыі савецкага партызанскага камандзіра ўласцівы міфалагічныя функцыі культурнага героя – аднаўляць парушаную справядлівасць/сацыяльны парадак і бараніць племя/дзяржаву ад ворагаў.

5. На абрадавую традыцыю і народную драму Беларусі паўплывала развітая і санкцыянаваная ў войску Расійскай імперыі XIX – пачатку XX ст., пераважна ў асяроддзі ніжніх чыноў, паратэатральная з’ява пад назвай «салдацкі тэатр». Гэта выразілася ў практыцы калядных «вайсковых абыходаў» – мадэрнізаваных формаў рухомых паказаў, адгалінаваных ад класічнай стацыянарнай народнай драмы, якія бытавалі ў зоне Брэсцкага, Гомельскага, Чарнігаўскага і Валынскага Палесся. Найбольшы ўплыў «салдацкага тэатра» (вербальны, акцыянальны, атрыбутыўны і персанажны коды) назіраецца ў семежаўскім абрадзе «Калядныя Цары» (першы беларускі элемент (2009) Спіса нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, якая вымагае пільнай аховы).

6. *Міфасемантыка* ваеннага фальклору абумоўлена дыхатаміяй міфалагем *жыццё – смерць*, праяўленай у славесных, славесна-музычных і абрадавых тэкстах як *мір – вайна, радзіма – чужына, свой – чужы/вораг/заваёўнік, свабода – акупацыя/палон, ахвяра – кат*. Яна рэалізуецца праз канцэпты традыцыйнай культуры (*салдат, лёс, гора, зямля, дом, маці, хлеб, мяжа*) і ідэалагемы новай героікі, засвоеныя з наратываў афіцыйнай савецкай ідэалогіі і прафесійнага мастацтва (*подзвіг, самаахвярнасць, савецкі патрыятызм*). Універсальным міфалагічным правобразам, каштоўнасна-сэнсавым ядром міфасемантыкі ваеннага фальклору выступае *архетып героя*. Ён тэкстуалізуецца ў сацыяльна дэтэрмінаваных фальклорных праекцыях *герояў – ахвяр* і *герояў – народных заступнікаў*, семантыка якіх разгортваецца ў дыяпазоне ад народнахрысціянскай сакралізацыі пакутніцкай смерці да новай героікі савецкага тыпу. Міфасемантыку калектыўных і індывідуальных засцерагальных практык, прафетычных аповедаў пра «знакі бяды» вызначаюць архаічныя народнарэлігійныя ўяўленні, перакадзіраваныя ў адпаведнасці з рэаліямі ваеннага часу.

7. Ваенны фальклор як мастацкі дыскурс – гэта абумоўленая ваенна-гістарычнымі рэаліямі сярэдзіны XIX–XX стст. знакава апасродкаваная

камунікацыя, асноўным кампанентам якой выступае традыцыйны тэкст. Семантычныя параметры ваеннага фальклору вызначае асэнсаванне рэалій вайны ў межах традыцыйнасці праз сукупнасць абагульненых культурна значных сэнсаў, уяўленняў і маральна-этычных установак, выражаных у дыскурсаўтваральных канцэптах, якімі з'яўляюцца міфалагемы *салдат, жыццё, смерць, вайна, доля, чужына, дом, маці*. Іх новая дыскурсіўная рэалізацыя – *партызан, камандзір, вязень/палонны, баявы/маральны подзвіг, вораг-фашыст, інвалід вайны, палон/лагер, медсястра/жанчына-суцяшальніца* – звязана з уплывам вайны на фальклорную свядомасць, што выражаецца ў дыскурсіўнай поліфаніі ваеннага фальклору – здольнасці засвойваць элементы іншых дыскурсаў, а таксама быць уключаным у іх.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыя з'яўляецца самастойным даследаваннем беларускага ваеннага фальклору XX ст. у шырокім гістарычным і культурным кантэксце, выкананым з улікам прыярытэтных кірункаў сучаснай навукі аб народнай творчасці на аснове пашырэння даследчага поля шляхам крытычнай пераацэнкі шэрага існуючых палажэнняў і ўвядзення значнага аб'ёму новага фактычнага матэрыялу (пісьмовыя дакументы з Архіва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, фондаў аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі, Цэнтральнага навуковага архіва НАН Беларусі і інш.). Палажэнні і высновы маюць арыгінальны характар. Публікацыі па тэме дысертацыі напісаны без суаўтараў і адлюстроўваюць асабісты ўклад саіскальніка.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання прадстаўлены ў форме дакладаў і выступленняў на рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях: Навуковай канферэнцыі прафесарска-выкладчыцкага складу БДУКМ «Научный поиск в сфере современной культуры и искусства» (Мінск, 2019, 2022, 2023 гг.); на міжнародных навуковых, навукова-практычных канферэнцыях і кангрэсах у Рэспубліцы Беларусь: Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе» (Пінск, 2017, 2018, 2019 гг.), X Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Традиции и современное состояние культуры и искусств» (Мінск, 2019 г.), IV Міжнародным кангрэсе гісторыкаў Беларусі «Историческая наука Беларуси: личности, концепции, достижения (к 90-летию Института истории НАН Беларуси)» (Мінск, 2019 г.), II Міжнародным навуковым кангрэсе беларускай

культуры (Мінск, 2020 г.), Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Женщины – ученые Беларуси и России» (Мінск, 2021 г.), Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Народная казкавая проза ў еўрапейскай прасторы: архаічная традыцыя vs сучасная інтэрпрэтацыя» (Мінск, 2021 г.), XIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай» (да 100-годдзя БДУ і 90-годдзя прафесара А. А. Лойкі) (Мінск, 2021 г.), X Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Мова – Літаратура – Культура», прысвечанай 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа (Мінск, 2022 г.), Круглым стале «Женщины – ученые Беларуси», прысвечаным Дню беларускай навукі і Году гістарычнай памяці (Мінск, 2022 г.), Міжнароднай завочнай навуковай канферэнцыі «Барышевские чтения» (Мінск, 2023 г.), XVII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Культура. Наука. Творчество» (Мінск, 2023 г.); на міжнародных навуковых канферэнцыях у краінах замежжа: Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Пространство фольклора, литературы и педагогики: Юдинские чтения – 2018» (Курск, Россия, 2018 г.), VIII Міжнароднай канферэнцыі «Рябининские чтения» (Петрозаводск, Россия, 2019 г.).

Тэарэтычныя палажэнні і тэкставы матэрыял дысертацыі апрабіраваны ў вучэбным працэсе філалагічнага факультэта БДУ ў межах вучэбнай дысцыпліны «Фальклярыстыка», якая выкладаецца для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках) (Акт № 2.4/19 ад 31.01.2024 г.).

**Апублікаванне вынікаў дысертацыі**

Асноўны змест дысертацыйнага даследавання і яго вынікі знайшлі адлюстраванне ў 32 публікацыях, сярод якіх: 1 манаграфія (15 аўт. арк.); 14 артыкулаў у навуковых выданнях, уключаных у пералік ВАК (11,48 аўт. арк.), 4 з якіх уключаны ў базы дадзеных Scopus, РІНЦ; 3 артыкулы ў замежных рэцэнзаваных выданнях (2,77 аўт. арк.), 1 з якіх уключаны ў базы дадзеных ERIH PLUS, Ulrich, РІНЦ; 6 артыкулаў у навуковых зборніках і часопісах (3,69 аўт. арк.); 8 матэрыялаў навуковых канферэнцый (2,76 аўт. арк.). Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў складае 35,7 аўт. арк.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Структура дысертацыі абумоўлена зместам даследавання. Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц. Агульны аб’ём дысертацыі складае 241 старонку, у тым ліку 208 старонак – асноўны тэкст. Бібліяграфічны спіс займае 27 старонак і ўтрымлівае 361 пазіцыю.

# АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Глава 1 «**Ваенны фальклор як частка беларускай гістарычнай і этнакультурнай спадчыны**» ўключае два раздзелы, прысвечаныя тэарэтыка-метадалагічным асновам даследавання беларускага ваеннага фальклору, гісторыі яго збірання і вывучэння.

У раздзеле 1.1 «**Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання беларускага ваеннага фальклору: агляд літаратуры»** адзначаецца, што ў айчыннай фалькларыстыцы яшчэ не адбылося заснаванага на прынцыпах гістарызму цэласнага асэнсавання ваеннага фальклору. Пры гэтым у працах даследчыкаў абазначана значная «прысутнасць» у фальклоры вобразаў войнаў і паўстанняў (XIV–XIX стст.). Тэарэтызацыя фалькларыстычнай спадчыны Першай сусветнай вайны ў беларускай навуцы пачынаецца пад уплывам ідэй Ю. Сакалова, М. Азадоўскага 1920–1930-х гг., якія фарміруюць тэндэнцыю інтэрпрэтаваць ваенны фальклор як спецыфічную з'яву новай фармацыі – «жывы паэтычны летапіс хуткабягучага жыцця». У 1940-я гг. у працах М. Азадоўскага, П. Багатырова, Л. Мухарынскай, Г. Астахавай, В. Крупянскай, С. Мінц, К. Квіткі, У. Чычарава ўзнікаюць новыя падыходы да названай праблематыкі, якія можна акрэсліць як «постфальклорнае пашырэнне»: 1) вобласць ваеннага фальклору ўпершыню пашыраецца за коштператэкстовак узораў прафесійнага мастацтва; 2) акрамя франтавых твораў, у сферу навуковага даследавання ўключаецца творчасць партызан, палонных і мірнага насельніцтва. Своеасаблівы ўзор навуковага каментарыя, на які арыентаваліся пазнейшыя даследчыкі і ўкладальнікі, прыводзіцца ў акадэмічным выданні «Материалы по истории песни Великой Отечественной войны» (1953). Гэта ідэйна-тэматычны аналіз твораў у спалучэнні з «падзейна-храналагічным» падыходам, што знайшоў выражэнне ў даволі ўмоўнай сістэматызацыі фальклорных тэкстаў паводле этапаў разгортвання вайны. Прыкладам служыць акадэмічнае выданне 1961 г. «Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны» (ІМЭФ АН БССР), над якім працавалі П. Глебка, І. Гутараў, С. Майхровіч, М. Грынблат, К. Кабашнікаў, І. Сцяпунін, І. Цішчанка. Беларуская эпічная спадчына як гераічны наратыў аб мінулым прадстаўлена ў акадэмічным выданні «Беларускі эпас» (1959). Яно выявіла нераспрацаванасць тэорыі эпічных жанраў у тагачаснай беларускай фалькларыстыцы. Галоўным яе здабыткам, развітым і даказаным пазней, з'яўляецца засвоены ўкладальнікамі ад сваіх папярэднікаў у навуцы пастулат, згодна з якім у беларускім фальклоры сувязь разнастайных жанраў фальклору са старажытнай эпічнай творчасцю выражаецца праз персанажны, акцыянальны коды і паэтычную вобразнасць.

Упэўненасць у здольнасці фальклорных жанраў адлюстраваць гістарычную эпоху з яе войнамі і сацыяльнымі катаклізмамі, перабольшанае значэнне творчай асобы і яе грамадзянскай пазіцыі ў фальклорным працэсе не пацвердзіліся ні ў далейшым развіцці фальклору, ні ў яго тэарэтычным асэнсаванні.

Беларускія фонды фальклорных матэрыялаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, паводле А. Фядосіка, В. Гусева, І. Беразоўскага, А. Сойманава, В. Сакалова, І. Гутарава, М. Грынблата, Т. Якіменкі, пачалі фарміравацца непасрэдна ў час вайны. Аднак ўяўленне пра значную эмпірычную базу ваеннага фальклору беларусаў – гэта міф, які сфарміраваўся, відавочна, пад уплывам вялікай колькасці гістарычных, публіцыстычных і літаратуразнаўчых прац, звязаных з ваеннай праблематыкай. Сёння асноўнай крыніцай па ваенным фальклоры служаць матэрыялы фальклорна-этнаграфічных экспедыцый 1940–1950-х гг. (АІМЭФ). Звязаныя з тэмай вайны пласты народнапесеннай і эпічнай спадчыны, абрадавых практык фрагментарна адлюстраваны ў энцыклапедыі «Беларускі фальклор» (2005–2006). У сістэме фалькларыстычных дэфініцый назіраецца пэўная гетэрагеннасць, што ўказвае на неабходнасць крытычнага пераасэнсавання шэрага палажэнняў і катэгорый з улікам корпуса тэкстаў, якія раней знаходзіліся на перыферыі навуковага дыскурсу.

Аналіз фалькларыстычнай базы па заяўленай тэме дае падставы зрабіць наступныя высновы: 1) беларускія і замежныя даследчыкі, асэнсоўваючы прыроду ваеннага фальклору ў гісторыка-сацыяльнай парадыгме, адлюстравалі ў сваіх працах шырокі спектр праблем уласна фалькларыстычнага і міждысцыплінарнага характару; 2) у навуковым дыскурсе Беларусі сёння назіраецца адраджэнне цікавасці да заяўленай тэмы пераважна ў антрапалагічным ракурсе; 3) аб’ектыўныя і суб’ектыўныя фактары (аб’ём назапашанай фактаграфіі, характар навуковых напрацовак па праблематыцы, сацыяльная запатрабаванасць вывучэння этнакультурнай спадчыны Беларусі XX ст.) даюць падставы для якасна новага канцэптуальнага даследавання беларускага ваеннага фальклору.

Раздзел 1.2 «**Гісторыя збірання і вывучэння ваеннага фальклору: этапы і асаблівасці ідэйна-мастацкіх трактовак**» уключае тры падраздзелы, у якіх упершыню прасочана станаўленне тэмы народнай творчасці пра вайну ў айчыннай навуцы.

У падраздзеле 1.2.1 «**Класічнае нарадазнаўства: традыцыяналізм фалькларыстычных інтэрпрэтацый**» акрэслены прычыны неасэнсаванасці ў навуцы канца XIX – пачатку XX ст. песень і іншых формаў народнай культуры,

абумоўленых вайной і вайсковай штодзённасцю. Акцэнтавана ўвага на тым, што першачарговай задачай беларускіх нарадазнаўцаў у гэты перыяд было адкрыццё шырокай аўдыторыі «беларускага свету»: распрацоўка пытанняў этнагенезу, этнічнай гісторыі беларусаў, вывучэнне абрадавай культуры, выяўленне ў ёй раннетрадыцыйных з'яў, рэліктаў архаічных вераванняў. Сцвярджаецца, што ў канцы XIX ст. у беларускай вёсцы адбываліся працэсы трансфармацыі сацыяльнага і культурнага жыцця, а з'явы надыходзячай індустрыяльнай эпохі паступова разбуралі патрыярхальны ўклад і спараджалі новыя папулярныя формы фальклору (мемуары А. Багдановіча). Гэта расцэньвалася нарадазнаўцамі адмоўна, як страта беларусамі самабытнасці. Адстаўныя салдаты, адыходнікі, жыхары гарадскіх ускраін, работнікі лічыліся носьбітамі мяшчанскай (пазней узнік эпітэт *дробнабуржуазнай*) традыцыі, недастаткова старой, каб сведчыць пра архаіку. Познетрадыцыйная песня атрымлівала спецыфічна другасны модус інтэрпрэтацыі ў нарадазнаўстве.

Адзначаецца, што навуцы былі вядомы ўзоры рэкруцкіх і салдацкіх песень. Найбольш рэпрэзентатыўна (87 тэкстаў) яны прадстаўлены Е. Раманавым у «Беларускім зборніку» (Вып. 1–2, 1885), у якім славуты збіральнік даў ацэнку іх укаранёнасці і распаўсюджанасці ў традыцыі. Пры гэтым Е. Раманаў, як і А. Пыпін, Я. Карскі, М. Янчук, прытрымліваўся ўстаноўкі асэнсоўваць культуру беларусаў як культуру грамадства аграрнага тыпу і з трывогай канстатаваў «адміранне» старажытнага фальклору. Такі настрой быў пашыраны ў культурніцкім асяроддзі 1910-х гг., якое гуртавалася вакол газеты «Наша ніва».

Першая сусветная вайна на пэўны час прыпыніла культурную дзейнасць у Беларусі. На прыкладзе творчай спадчыны М. Гарэцкага, Я. Карскага, А. Грыневіча паказана, што трагічнасць вайны і яе быційныя аспекты засланялі сабой ідэю фіксаваць стыхію народнай творчасці. Так, у зборніку М. Гарэцкага «Народныя песні з мелодыямі» (1928), праца над якім вялася адначасова з падрыхтоўкай дакументальнай аповесці «На імперыялістычнай вайне», змешчана 318 каляндарна- і сямейна-абрадавых тэкстаў. Салдацкая песня нядаўняй вялікай вайны, сведкам бытавання якой быў М. Гарэцкі, не ўвайшла ў гэты зборнік, бо не адпавядала сфарміраваным сярод інтэлігенцыі ўяўленням пра фальклор беларусаў.

На збіранне і папулярызацыю «знікаючых старадаўніх песень і звычаяў» арыентаваліся ў 1923–1928 гг. дзеячы Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Інбелкульце (праграмы А. Грыневіча (1925), А. Шлюбскага (1928)). Адсутнасць у полі зроку фалькларыстаў фактаў народнай традыцыі, у якіх увасоблены калектыўны вопыт перажывання войнаў і нясення вайсковай службы,

абмяжоўвала магчымасці навуковай інтэрпрэтацыі вялізнага пласта фальклору Вялікай Айчыннай вайны.

Падраздзел 1.2.2 **«Савецкі этап: у парадыгме сацыялістычнага рэалізму»** пачынаецца з характарыстыкі *перадваеннага дзесяцігоддзя*, калі ў тэорыі і збіральніцкай практыцы беларускай навукі аб народнай творчасці сцвярджаецца абумоўлены задачамі канструявання новай савецкай ідэнтычнасці метад сацыялістычнага рэалізму (1934). Пад кіраўніцтвам сістэмы дзяржаўных устаноў БССР пашыраецца аматарская і самадзейная творчасць, у фалькларыстыцы легалізуецца актыўны самадзейны аўтар, які ўжо не застаецца ананімным, як у традыцыйнай культуры, а імкнецца да вядомасці і сацыяльнага прызнання. Многія дзеячы культуры інкарпараваны ў працэс пошуку (і канструявання) узораў савецкага фальклору (палявыя матэрыялы Р. Шырмы, М. Грынблата, Ф. Рубцова, Н. Сакалоўскага, М. Равенскага, І. Сербава, М. Калачынскага, Э. Галубка, А. Слабадзецкага, А. Пялевіча, М. Меяровіч і інш.). Адзначана, што падчас разгорнутай з энтузіязмам збіральніцкай працы было зафіксавана шмат каштоўнага матэрыялу, распрацаваны напрамкі палявых даследаванняў (уклад у беларускую этнамузыкалогію Я. Гіпіуса і З. Эвальд). Аўтэнтычныя ўзоры ваеннай песні падаюцца ў зборніку М. Грынблата «Песні беларускага народа» (Т. 1, 1940).

*Перыяд 1941–1945 гг.* характарызуецца разгортваннем (з 1942 г.) збіральніцкай працы ва ўмовах Вялікай Айчыннай вайны, трактоўкай народнай творчасці як ідэйнай зброі ў барацьбе з ворагам, фарміраваннем у грамадстве ідэі важнасці фіксацыі фальклору (звароты, праграмы), экспедыцыямі ў вызваленыя раёны, работай з карэспандэнтамі. Навуковая грамадскасць успрымае задачы збірання фальклору вайны не толькі як патрыятычны абавязак, але і як магчымасць назіраць і фіксаваць унікальную з'яву народнай культуры (успаміны А. Фядосіка, Л. Пушкарова, М. Новікава, І. Яфрэмава, М. Імшанецкага).

У *перыяд 1945–1956 гг.* пачынаецца экспедыцыйная дзейнасць беларускіх вучоных. На акадэмічным узроўні замацоўваецца кананізацыя ваеннага фальклору. Народная творчасць выступае тэмай маштабных масавых мерапрыемстваў па развіцці мастацкай самадзейнасці і збіранні савецкага фальклору. Аднак уключэнне палявых матэрыялаў беларускіх фалькларыстаў у акадэмічны дыскурс запавольваюць сацыяльныя фактары, якія выяўляюць разрыў паміж дэклараваным мастацтвам новай эпохі і традыцыйнай народнай культурай.

У *перыяд 1956–1980-х гг.* у фалькларыстыцы дамінуе марксісцка-ленінская канцэпцыя народнай творчасці. Задачы мэтанакіраванага збору

фальклору Вялікай Айчыннай вайны саступаюць месца задачам яго тэарэтычнага асэнсавання. Пачынаецца распрацоўка прынцыпаў публікацыі фальклорных тэкстаў і іх навуковага каментавання (І. Цішчанка). Даследавана, хаця і тэндэнцыйна, частка матэрыялаў (пераважна песні), сабраных падчас экспедыцый 1957, 1958, 1960 і 1962 гг. у розныя раёны Беларусі пад кіраўніцтвам і з удзелам М. Грынблата, Г. Цітовіча, Л. Барага, М. Меяровіч, Р. Шырмы, І. Гутарава, М. Клімковіча, І. Даўгялы, Г. Барташэвіч.

У падраздзеле 1.2.3 **«Постсавецкі этап: ступень даследаванасці ваеннага фальклору»** доказна сцверджана, што інтэрпрэтацыі беларускага ваеннага фальклору даюцца ў ракурсах, выпрацаваных у савецкі час, на аснове класічных тэкстаў (XIX – пачатак XX ст.) пераважна песенных жанраў з гісторыка-публіцыстычным, краязнаўчым і аўтабіяграфічным каментаваннем. З 2000-х гг. у шэрага гістарычных даследчых праектаў распрацоўваецца гісторыка-антрапалагічнае разуменне мінуўшчыны. Акрэсленае як «чалавечае вымярэнне вайны», яно пралівае святло на сферы быцця, якія традыцыйна не разглядаліся савецкай навукай. Аднак навуковы дыскурс па дадзенай тэме сфарміраваны толькі часткова. Улічваючы агульную колькасць сучасных работ на тэму народнай творчасці, прысвечанай вайне, рэзюмуем: беларускі ваенны фальклор пакуль застаецца адным з нявыкарыстаных рэсурсаў асэнсавання нацыянальнай этнакультурнай спадчыны.

У главе 2 **«Эвалюцыйныя працэсы ў беларускім ваенным фальклоры XX ст.: змест і формы мастацкай рэалізацыі»** аб’ект даследавання аналізуецца як складана арганізаваная, адкрытая сістэма з неабходнымі параметрамі самаарганізацыі, якая адначасова валодае супрацьлеглымі якасцямі – паўтаральнасцю і зменлівасцю. Даказана, што эвалюцыйныя працэсы ў фальклоры абумоўлены дыялектыкай яго дыяхранічнай трансляцыі – захаваннем традыцыйнасці пры здольнасці змяняцца, адпавядаць духу часу.

У раздзеле 2.1 **«Ваенная песня XX ст.: вытокі, мастацкая вобразнасць і жанравая спецыфіка»** на аснове канцэпцыі постфальклору (*С. Няклюдаў*) асэнсавана дынамічная прырода ваеннай песні XX ст. як вынік узаемадзеяння розных этнічных традыцый і тыпаў культуры (традыцыйнай, масавай, афіцыйнай). Даказана, што найбольш раннія песенныя матывы і сюжэты, якія фарміруюць у беларускім фальклоры вобразы салдата/служывага чалавека, вайсковай службы і вайны, засвоены з казацкай (з XVI–XVII ст.), рускай рэкруцкай, салдацкай песень і рэпертуару рэгулярнай арміі Расійскай імперыі (XIX ст.). Яны трактуюцца як *устойліва засвоеныя запазычанні*. Адзначаецца, што сацыяльных перадумоў узнікнення аўтэнтычнай беларускай салдацкай песні не сфарміравалася, бо беларускае сялянства ў сваёй большасці да XIX ст.

не несла вайсковага абавязку. Саслоўная структура царскай арміі, бяспраўе салдат, працяглы тэрмін службы ў першай палове XIX ст. сфарміравалі каардынаты семантычнага поля беларускай рэкруцкай і салдацкай песень, у выніку чаго матывы трагічнай долі рэкрута, развітання яго з сям'ёй, смерці салдата на полі бою сталі класікай народнай лірыкі.

На жанравае развіццё ваеннай песні ўплывала і тое, што ў рэгулярнай арміі Расійскай імперыі носьбіты народнай традыцыі траплялі ў спецыфічныя ўмовы, якія спараджалі новыя формы мастацкай творчасці. Салдацкае жыццё, штодзённасць і вайсковыя паходы сталі той сферай, у якой сутыкненне сялянскай мастацкай свядомасці з новай сацыяльнай рэальнасцю праявілася вельмі выразна. Адбывалася актыўная інтэрферэнцыя розных народнапесенных традыцый, абумоўленая пераважна сялянскім складам вайсковых фарміраванняў і закрытым (казарменным) існаваннем салдат. Акрамя таго, у канцы XVIII ст. у воінскіх часцях рэгулярнай арміі пачалі фарміравацца саставы музыкантаў, песельнікаў і хору, якія забяспечвалі правядзенне рытуалаў, музычна-песеннае суправаджэнне руху войскаў і інш. Нярэдка пры гэтым выкарыстоўваліся лёгка пазнавальныя фальклорныя мелодыі і тэксты. У канцы XIX ст. укараненню народнай песні ў армейскі рэпертуар садзейнічалі музыканты, кампазітары, збіральнікі і папулярызатары народнай музыкі, некаторыя з іх былі сябрамі Песеннай камісіі РГТ (створана ў 1884 г.).

Пад уплывам гістарычных падзей і войнаў XX ст. адбываліся інтэнсіўныя фальклоратворчыя працэсы, што праявілася ва ўзбагачэнні рэпертуару, развіцці функцый і формаў бытавання беларускай ваеннай песні. Тэндэнцыі эвалюцыі паэтыка-музычных тэкстаў выяўлены на прыкладах «песень з вялікай біяграфіяй» (ніжняя храналагічная мяжа бытавання некаторых узораў можа акрэсліваццa XVIII ст., верхняя – пачаткам XXI ст.). Працяглае існаванне песні ў вусным рэпертуары носьбітаў было вынікам *фальклярызацыі* і прыводзіла да фарміравання *песенных гнёздаў* – сукупнасці паэтычных тэкстаў і напеваў, якія ўзыходзяць да адзінай крыніцы (прататэксту), але могуць адрозніваццa сюжэтна і не зводзяцца да інварыянта. У адным гняздзе суіснуюць варыянты з разначасовымі прымеркаваннямі да гістарычных падзей XIX–XX стст.

На аснове архіўных матэрыялаў вылучаны найбольш прадуктыўныя ў беларускай ваеннай песнятворчасці песенныя гнёзды і іх прататэксты. Сярод іх песня «*Там сонца закацілася за цёмныя ляса*» на баладны сюжэт «Непазнаны муж вяртаецца з вайны». Упершыню апублікаваная ў 1866 г., яна фіксавалася беларускімі даследчыкамі падчас Вялікай Айчыннай вайны і пазней (апошні вядомы запіс зроблены ў 1958 г.). «*Чайка*» («*Над возерам чаечка ўецца*») – песня ваенных маракоў часоў Руска-японскай вайны (1904–1905), варыянты

якой у 1920-я гг. узніклі ва Усходняй Сібіры і на Далёкім Усходзе Расіі. У 1940-я гг. песня рамансавага тыпу «Чайка» пра гібель партызанскага атрада зафіксавана ў розных раёнах БССР, адзначана яе прыналежнасць да рэпертуару партызан і франтавікоў. Песня «*Пад зялёнаю ракітай*» у XIX ст. уваходзіла ў рэпертуар шырокіх казацкіх і салдацкіх мас (прататэкстам служыць верш 1831 г.). У войнах XX ст. яна атрымала значную ідэйную перакадзіроўку, захаваўшы архаічны матыў «смерць як жаніцьба», і ўвайшла ў масавую культуру новага часу (рэдукаваны варыянт старога сюжэта вядомы пад назвай «*Чорны воран*»). Песня баладнага тыпу пра трагічную сустрэчу брата і сястры «*На гарызонце зара загаралась*» узнікла ў выніку фалькларызацыі элегічнага верша «Умер» 1885 г. Варыянты ўтрымліваюць фармальна-гістарычныя адсылкі да падзей Руска-японскай вайны, рэвалюцыі ў Расіі, паўстанняў у арміі і на флоце, баявых аперацый Першай сусветнай вайны. У 1940-я гг. песня «На гарызонце зара загаралась» запісвалася на Міншчыне як распаўсюджаная сярод беларускіх партызан.

Паказальнымі ў плане эвалюцыі старой песеннай традыцыі служаць таксама развітыя песенныя гнёзды вядомых з канца XIX ст. матроскай песні «*Качагар*» («*Раскинулось море широко*») і шахцёрскай песні «*Канагон*». У рэпертуары франтавікоў, партызан і остарбайтараў бытаваліператэкстоўкі, у якіх лірычны герой выступае не толькі ахвярай трагічных абставін. З’яўляецца зусім новы ў кантэксце традыцыйнай народнай песеннасці матыў подзвігу героя. Адзін з такіх тэкстаў пра подзвіг лётчыка апублікаваны І. Гутаравым у зборніку «Борьба и творчество народных мстителей» (1949). Іншыя «ваенныя варыянты» песень «*Качагар*» і «*Канагон*» запісаны ў Беларусі ў 1950-я гг. Ліра-эпічная салдацкая песня «*Закацілась ды жаркае сонца*» таксама належыць да тых твораў, якія пасля дзвюх вялікіх войнаў XX ст. працягвалі фіксавацца беларускімі збіральнікамі.

Выразным прыкладам устойлівасці з’яў позняй народнапесеннай традыцыі служыць таксама песеннае гняздо, утворанае вакол тэксту «*Ой, да ўспомнім, братцы*». На думку асобных даследчыкаў, яго першакрыніцай выступае казацкая песня на тэму баталіі часоў Паўночнай вайны. У Руска-турэцкай вайне 1877–1878 гг. песня бытавала як страявая і выконвалася пад барабанны бой, пра што сведчаць рэаліі аднаго з найбольш вядомых эпізодаў гэтай вайны – абароны Шыпкі. У 1973 г. Г. Барташэвіч і П. Альхімовіч запісалі названую песню ў Кіраўскім раёне Магілёўскай вобласці з каментарыем: «*Партызанская, што спявалася “ў гэту вайну”*». Паказальна тое, што кіраўскі варыянт захаваў устойлівыя элементыператэкстовак XIX ст. і Першай сусветнай вайны.

На прыкладах згаданых вышэй і шэрага іншых твораў даказана, што эвалюцыя ваеннай песні разгортваецца ад раннетрадыцыйных *баладных* і *ліра-эпічных* формаў XIX ст. да развітых у XX ст. *песень рамансавага тыпу* з рознай ступенню суаднесенасці з першакрыніцамі. У семантыцы вобразаў развіваецца лірычны пачатак, суб'ектнасць герояў і іх уключанасць у парадыгму сацыяльнага.

Раздзел 2.2 **«Тэкстуалізацыя эпічнага сюжэта ў гістарычных паданнях пра партызанскага камандзіра»** прысвечаны гістарычным паданням з цэнтральным вобразам партызанскага камандзіра Вялікай Айчыннай вайны Канстанціна Заслонава. Гэта практычна адзіная развітая колькасна і значная ў мастацкіх адносінах сюжэтна-тэматычная група беларускіх гістарычных паданняў, рэпрэзентатыўнасць якіх пацверджана падрабязнай атрыбуцыяй (матэрыялы экспедыцый Л. Барага і М. Меяровіч 1943, 1945–1946 гг.) і тыпалагічна падобнымі фактамі, зафіксаванымі ў пасляваенны час іншымі даследчыкамі (аповеды пра С. Каўпака, П. Стральца, Д. Мальцава, Д. Собалева і інш.).

Даказана толькі абазначаная Л. Барагам у 1948 г. генетычная сувязь аповедаў пра Заслонава (сюжэт «Партызанскі камандзір дзейнічае ў нямецкім тыле») з гістарычнымі паданнямі пра вайну 1812 г. (сюжэт «Платаў[1] як непазнаны госць у француза»). Разгледжана прысутнасць «платаўскага сюжэта» ў фальклоры, выразнай праявай чаго служыць песенны «платаўскі цыкл». Ён рэпрэзентуе своеасаблівую жанравую разнавіднасць – песні пра «айцоў-камандзіраў», характэрныя для салдацкага і казацкага асяроддзя XVIII–XIX стст. Выдадзеныя ў зборніках Е. Раманава (1886), У. Дабравольскага (1903), яны фіксаваліся беларускімі савецкімі фалькларыстамі ў экспедыцыях канца 1950-х гг., праўда, у рэдукаваных формах. Поўны матыўны фонд «платаўскага сюжэта» выяўлены на прыкладзе гістарычнага падання са зборніка А. Сержпутоўскага «Казкі і апавяданні беларусаў з Слуцкага павета» (1926). З улікам палажэнняў сучаснага эпасазнаўства (працы Б. Пуцілава, У. Пропа, Л. Емяльянава, Н. Крынічнай) прасочана эвалюцыя сюжэтнай схемы і яе сувязь з эпічнай архаікай.

На аснове выяўленага матыўнага фонду зроблены аналіз наяўных (апублікаваных і неапублікаваных) аповедаў пра Канстанціна Заслонава, у выніку чаго даказана паслядоўная тэкстуалізацыя ўсіх матываў. У рознай ступені варыятыўнасці аповеды пра дзейнасць камандзіра аршанскай

[1] Платаў – фальклярызаваны вобраз расійскага ваеннага дзеяча, атамана Данскога казацкага войска Мацвея Платава (1753–1818).

партызанскай групы «дзядзі Косці» суадносяцца з сюжэтамі «Падман праз блеф» (K1700-K1799), «Падманы шляхам маскіроўкі ці ілюзій» (K1800-K1899), «Самазванцы» (K1900-K1999) (паводле ўказальніка С. Томпсана), з сюжэтам анекдота «Злодзеі ўбіраюцца ў паліцэйскіх: пад выглядам вобыску рабуюць багатага гаспадара» (*1526I) (паводле ўказальніка К Чыстова). У сюжэтыцы і вобразнасці аповедаў пра Канстанціна Заслонава назіраецца ўплыў сацыяльна-бытавой, навелістычнай і чарадзейнай казак. Персанажны код чарадзейнай казкі рэпрэзентуе вобраз *дзеда/старычка*, семантыка якога абумоўлена архетыпамі мудрага старога, памочніка-дарыцеля. Рысамі мудрага старога надзяляецца і сам Заслонаў, і ўваскрэслы чырвоны камандзір Васіль Іванавіч Чапаеў, з якім звязаны характэрны для цыкла ўсходнеславянскіх паданняў пра гістарычных асоб матыў «вяртанне збавіцеля». Элементы сюжэта чарадзейнай казкі ў многіх выпадках кантамінаваны з новаўтварэннямі, абумоўленымі рэаліямі вайны (*допыт у немцаў, расправа над старым, смерць героя ад «разрыўчатай» кулі*). Выяўлены самабытны сюжэт з асноўным матывам «партызанскае вяселле».

У выніку фалькларызацыі вобраз партызана-чыгуначніка Канстанціна Заслонава («дзядзі Косці») ператварыўся ў сукупнасць рэальнага і легендарнага і мае выразны казачны і міфалагічны кампаненты. Набыўшы абрысы і функцыянальныя характарыстыкі эпічнага героя, ён стаў служыць увасабленнем абаронцы, змагара з сіламі зла, адпавядаючы глыбінным псіхалагічным і культурным архетыпам, якія ляжаць у аснове народнай эпічнай традыцыі.

У раздзеле 2.3 **«“Вайсковыя абыходы” як з’ява народнай відовішчнай і абрадавай культуры»** разглядаюцца факты абрадавай традыцыі беларусаў, узнікненне і развіццё якіх абумоўлена непасрэдным уплывам вайсковага асяродку. Упершыню ў нарадазнаўчым кантэксце вызначана, што ў XIX ст. «ваенная прысутнасць» у Заходніх (Ковенскай, Віленскай, Гродзенскай, Мінскай) і Беларускіх (Віцебскай, Магілёўскай, Смаленскай) губернях была даволі значнай. Маштабныя працэсы вайсковага характару ў 1854–1862 гг. уздзейнічалі на ўсе бакі грамадска-палітычнага развіцця і паўсядзённае жыццё насельніцтва. Найбольш выразна ўплыў расквatараванага ў губернях вайсковага кантынгенту на штодзённасць беларускіх сялян мог праяўляцца праз «салдацкі тэатр» – паратэатральную з’яву, санкцыянаваную ўладай і распаўсюджаную ў войску Расійскай імперыі XIX ст. Рэпертуар салдацкіх тэатраў вызначаўся традыцыямі рускага народнага тэатра. Асноўным быў камедыйны сюжэт пра цара Максімільяна і яго непакорнага сына Адольку, да яго далучаліся сцэнкі, устаўкі песеннага і літаратурнага зместу. Падобныя

сінтэтычныя дзеі пад назвамі «Маскарад», «Трон», «Лодка», «Разбойнікі» і г. д. ставіліся на святы непасрэдна ў вайсковых частках і на сцэнах «народных дамоў» – дабрачынных устаноў Расійскай імперыі канца XIX – пачатку XX ст.

Вельмі папулярныя не толькі ў войску, але і на флоце, у рабочым, гарадскім асяроддзі народныя драмы інтэнсіўна пашыраліся на тэрыторыі ўсёй Расійскай імперыі, а таксама ў зонах беларускага і ўкраінскага Палесся. Пра гэта сведчаць этнаграфічныя, гісторыка-літаратурныя і публіцыстычныя працы Е. Раманава, А. Малінкі, У. Калаша, Р. Волкава, В. Машкова, І. Яроміна, Б. Яцымірскага, У. Ястрабава, М. Вінаградава, П. Сцяпанава, М. Анчукова і інш. Імі адзначаецца, што шмат дзе калядныя прадстаўленні-абыходы першапачаткова выконваліся з дазволу начальства салдатамі, а моладзь (хлопцы-мяшчане) ахвотна навучаліся і пераймалі традыцыю. Найбольш паслядоўна даследчыкі адлюстроўвалі тэмпаральны (*Шчодры вечар*) і атрыбутыўны аспекты абрадавых абыходаў, акцэнтуючы ўвагу на элементах касцюма ўдзельнікаў (*мундзір*, *марынарка* з *залатымі галунамі на грудзях*, *эпалеты*, *скураныя кушакі з бляхай*, *шашкі праз плячо* і інш.) як на асноўных матэрыяльных аб'ектах, звязаных з практыкай іх бытавання. У сістэме персанажнага кода народнай драмы ў выкананні салдацкага тэатра, акрамя вобразаў класічнай батлейкі, асобную падсістэму ўтвараюць вайсковыя вобразы (*фельдмаршал*, *афіцэр*, *улан*, *воін*, *салдат*, *маскаль*, *казак*). У падобных абыходах, больш дынамічных за стацыянарныя паказы, былі засвоены і прадуктыўна развіліся гульнёва-забаўляльныя «вайсковыя прыёмы» (*хаджэнне страявым крокам*, *аддаванне загадаў*, *рапартаў*, *каманд (налева/направа/кругом/шагам марш)*, *падыманне ўгору шабляў*, *пералічэнне артыкулаў вайсковага статута* і інш.).

У ліпені 1956 г. падчас Мінска-Гомельскай этнаграфічнай экспедыцыі АН БССР І. Цішчанка зафіксаваў ад інфарманткі 1877 г. н. з Рэчыцкага раёна апісанне каляднага ігрышча пад назвай «Мушкарат». У асноўных ідэйна-тэматычных параметрах яно супадае з паказамі народнай драмы, змест якой складаюць кантамінаваныя сюжэты «Цара Ірада», «Цара Максімільяна» і гульнёва-драматызаваныя дзеі «ваджэння казы». Пра «Мушкарат» і тыпалагічна падобныя калядныя абыходы як пра распаўсюджаныя ў вёсках на поўдні Гомельскага павета ў 1912 г. пісаў Е. Раманаў. Відавочна, рэчыцкі абыход з'яўляецца рэдукаваным варыянтам ці мадыфікацыяй каляднага абыходу, вядомага пад назвай «Цары» («Калядныя цары»), які бытуе ў лакальнай культурнай традыцыі в. Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці.

Адносна паходжання семежаўскіх «Цароў» – знакавай з’явы беларускай этнакультурнай спадчыны[2] – у навуцы прынята не распрацаваная да канца *батлейкавая* версія. Далейшае вывучэнне семантыкі першага беларускага элемента Спіса нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА павінна разгортвацца ў кірунку параўнальна-гістарычнага даследавання, гісторыка-этнаграфічнага і мастацтвазнаўчага аналізу атрыбутыўнага абрадавага кода (касцюм вайсковых персанажаў семежаўскіх «Цароў» і яго сувязь з абмундзіраваннем рускага войска XVIII–XIX стст.). У прыватнасці, манера нашэння і элементы касцюма «Цароў» могуць быць «расшыфраваны» як адзінкі вайсковага рыштунку (*ківер, султан, этышкетныя шнуры, галуны, наплечныя партупеі, ранцавыя плечавыя рамяні з нагруднай перацяжкай* і інш.). Асноўная песня семежаўскага абыходу «Посею лебеду на берегу», паводле класічнай працы на тэму рускай народнай песні М. Лапаціна і В. Пракуніна (1889), маркіруе сацыяльную групу салдат, якая прынесла яе ў лакальную народную традыцыю. Згодна з нашай гіпотэзай, семежаўскія «Цары» – «вайсковы абыход», мадэрнізаваная (рухомая) форма стацыянарнай народнай драмы, адгалінаваная ад класічнай (стацыянарнай) пад уплывам культуры вайсковага соцыуму ў другой палове XIX ст.

Адзначаецца, што пэўны інфарматыўны патэнцыял для вывучэння з’яў беларускай народнай культуры, паходжанне і семантыка якіх звязаны з вайсковай службай, маюць і іншыя з’явы абрадавага фальклору, напрыклад, традыцыя шчадравання «Конікі» ў Давыд-Гарадку Столінскага раёна[3]. Доказам служаць персанажны, атрыбутыўны і вербальны коды абраду: галоўны персанаж – салдат на «кані», сярод адзінак атрыбутыўнага кода – музычныя і сігнальныя інструменты (*ражок, труба, горн, барабан*). Галоўная песня «Конікаў» – нетыповая для сялянскай традыцыі шчадроўка з разгорнутым баладным матывам «воін гаворыць са сваім канём».

Глава 3 «**Міфасемантыка беларускага ваеннага фальклору»** прысвечана выяўленню міфасемантычнай прыроды славесна-музычных, славесных і абрадавых тэкстаў ваеннага фальклору.

---

[2] У 2007 г. абрад «Калядныя Цары» вёскі Семежава ў катэгорыі «Традыцыйныя цырымоніі» быў унесены ў Спіс элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. У 2009 г. абрад «Калядныя Цары» ўключаны ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, якой патрабуецца тэрміновая ахова (англ. *List of Intangible Cultural Heritage in Need of Urgent Safeguarding*).

[3] У 2020 г. традыцыя шчадравання «Конікі» ў Давыд-Гарадку Столінскага раёна была ўнесена ў Спіс элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны (НКС), уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

У раздзеле 3.1 «**Архетып героя ў фальклорных сюжэтах савецкай героікі**» сцверджана, што героіка змагання, вайсковага супраціву захопнікам як модус паводзін і маральна-этычная максіма практычна не ўласцівая традыцыйнай сялянскай культуры. Яна фарміруецца і набывае мастацка-вобразнае напаўненне ў тэкстах вуснай традыцыі найноўшага часу. Савецкая героіка, заснаваная на каштоўнасных установках ахвярнасці, калектывізму, савецкага патрыятызму з палярызацыяй каштоўнасцей праз дыхатамію «свой – чужы», сфарміравала санкцыянаваную грамадствам ідэальную мадэль паводзін грамадзяніна, якая і была засвоена фальклорам. Універсальным міфалагічным правобразам, каштоўнасна-сэнсавым ядром міфасемантыкі ваеннага фальклору выступае *архетып героя*, які рэалізуецца ў сацыяльна дэтэрмінаваных фальклорных праекцыях *герояў – ахвяр* і *герояў – народных заступнікаў*.

Абумоўленая калектыўнай траўмай вайны культурная ўніверсалія героя – ахвяры выступае неад'емным элементам культурнай камунікацыі, забяспечваючы эмацыянальную і маральную кансалідацыю носьбітаў традыцыі. Гэта даказваецца на ўзорах фальклорных твораў з матывамі ахвярнай героікі і (ці) пакутніцкай смерці. Выразным прыкладам сужыць песня «*Каласілась у полі рож густая*», прататэкстам якой з'яўляецца пралог папулярнай паэмы І. Малчанава пад назвай «Дьяков Петр» (1929). Вобраз «вогненнага трактарыста» – актывіста арганізацыі калгасаў у Сібіры – у працэсе фальклярызацыі ў партызанскай Беларусі быў пераасэнсаваны ў *Колю-трактарыста*, забітага немцамі. Фактарам устойлівасці і стабілізатарам прататэксту служыць напеў (рытма-меладычная аснова) і ініцыяльная паэтычная формула: *Каласілась у полі рож густая, / Шэвелілісь усікі аўса, / Гдзе-та за дзерэўнею далека / Дзевічьі звінелі галаса*. У 1940–1950-я гг. інфарманты называлі песню «*Каласілась у полі рож густая*» партызанскай. У Беларусі ў жывым бытаванні яна фіксавалася яшчэ ў 2000-я гг.

З разгледжаных у дысертацыйным даследаванні найбольш рэльефна матывы пакут героя-ахвяры ўвасоблены ў тых народнапесенных творах, якія ўзніклі вакол значнага элемента персанажнага кода савецкай героікі – Зоі Касмадзям'янскай. З яе легендарным вобразам звязана семантычнае напаўненне песень ваеннага часу «*У сырым падвале за рашоткай*», «*Сяло с рассвета вышла із тумана*», «*Тишина. Ни огонька, ни звука*», «*Партызанская Сямёнаўна*». Варыянты з матывамі даваеннага шчаслівага жыцця, развітання дзяўчыны з маці, катаванняў, апошняга слова гераіні дэманструюць выразны зрух жанравай і змястоўнай мяжы ад савецкай героікі да познетрадыцыйных баладных і прыпеўкавых формаў, якія раскрываюць трагізм сутыкнення чалавека з вайной. Матэрыялы пасляваенных экспедыцый беларускіх вучоных

паказваюць, што песні пра гібель партызанкі Зоі (Тані) бытавалі сярод насельніцтва, партызан Браншчыны, Смаленшчыны і сумежных з імі раёнаў Беларусі.

Прыкладам тэкстуалізацыі архетыпа героя ў яго праекцыі народнага заступніка з’яўляецца вобраз Канстанціна Заслонава. Яго мемарыялізацыя пачалася з газетных публікацый 1943 г. і твораў прафесійнага мастацтва 1940-х гг.[4], у выніку чаго ў народнай творчасці пасляваенных гадоў партызанскі камандзір набыў легендарныя рысы. Першыя песні пра Заслонава фалькларысты пачалі запісваць увосень 1943 г. непасрэдна ад партызан[5]. У 1944 г. рукапісны літаратурна-мастацкі зборнік «Народный мститель» (Віцебская вобл.) 1-й партызанскай брыгады імя К. С. Заслонава ўжо публікаваў на сваіх старонках «Песню о комбриге» і авантурна-навелістычную прозу пра яго. Большасць наяўных сёння варыянтаў песні «*Каля Оршы рошча небальшая*» зводзяцца да аднаго сюжэтнага тыпу-кантамінацыі старой салдацкай і казацкай песень XIX в. «В чистом поле под ракитой» (у даваенны час вядомай у апрацоўцы на муз. У. Захарава, сл. М. Ісакоўскага) і верша самадзейнага паэта М. Нязлобіна (*Есть курган в родимой Белоруси*). У песнях пра Заслонава паслядоўна адлюстроўваецца наступальная актыўнасць галоўнага персанажа (*Дзядзя Косця – камандзір Заслонаў / Гаварыў рэбятам:* «*Усё пусцяк, / Пад аткос пушчайце эшалоны, / Вот граміць фашыстаў нужна так!*»), рэаліі партызанскай дзейнасці, матывы клятвы адпомсціць і вечнага сну як канстатацыі смерці (*спіць герой – Заслонаў Канстанцін*), якія суправаджаюцца элементамі фальклорнай паэтыкі.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны імёны «старой гвардыі» – ваенных і дзяржаўных дзеячаў В. Чапаева, М. Фрунзэ, М. Тухачэўскага, С. Будзённага, К. Варашылава – былі вельмі папулярнымі ў Чырвонай Арміі як імёны «айцоў-камандзіраў» часоў грамадзянскай вайны. Іх захаванасць у народнапесеннай традыцыі была абумоўлена інерцыйнасцю культуры вайсковага соцыуму. Аднак у большасці разгледжаных тэкстаў ваеннай песні сярэдзіны ХХ ст. фальклupрызаваныя вобразы згаданых гістарычных асоб ужо страцілі індывідуальныя рысы і суіснавалі з абагульненымі вобразамі герояў – народных заступнікаў (*камандзір, партызан, матрос*).

[4] Вобразу партызана прысвечана «Баллада о Заслонове и его адъютанте» (1943) І. Уткіна, п’еса А. Маўзона (1946), паводле якой у 1949 г. на кінастудыі «Беларусьфільм» знялі першы ў БССР фільм пра Вялікую Айчынную вайну, і інш.

[5] 1-я партызанская брыгада імя К. С. Заслонава была створана 15 ліпеня 1942 г. Насіць яго імя брыгада стала пасля гібелі Заслонава 14 лістапада 1942 г.

Раздзел 3.2 **«Засцерагальныя практыкі як сродак пераадолення пагроз вайны»** прысвечаны з'явам штодзённасці насельніцтва акупаваных тэрыторый Беларусі, якія доўгі час знаходзіліся на перыферыі навуковага інтарэсу збіральнікаў, паколькі даследчыцкі пошук савецкіх вучоных у сферы ваеннага фальклору факусіраваўся ў першую чаргу на песнях і аповедах героіка-патрыятычнага гучання.

Разглядаецца жаночая камунікатыўная трансмісійная засцерагальная практыка выпякання і распаўсюджання хлеба пад назвай «хаджэнне хлеба», цэнтральнай інтэгруючай ідэяй якой выступае міфалагема хлеба. У навуковым дыскурсе першыя кароткія звесткі пра яе бытаванне з'яўляюцца ў канцы 1940-х гг. Аналіз матэрыялаў экспедыцый М. Меяровіч і М. Грынблата ў розныя рэгіёны Беларусі (1945, 1946 і 1951 гг.) і іншых крыніц дазваляе канцэптуалізаваць згаданую практыку. Яе семантыку і прагматыку вызначаюць міфалагічныя канцэпты *хлеб*, *вайна* і *мяжа.* Суб'ектамі выступаюць *круглыя сіроты, чэсныя ўдовы, падарожныя,* якія ў традыцыйнай культуры надзелены медыятыўным статусам, здольнасцю да кантактаў з іншасветам і адыгрываюць значную ролю ў «рытуалах бедства». Як рэпрэзентанты вясковай супольнасці яны распаўсюджваюць аброчны хлеб, тэхналогія прыгатавання якога з'яўляецца вынікам фальклорнага пераасэнсавання практыкі выпякання прасфор для праваслаўнай літургіі. Абумоўленасць «хаджэння хлеба» праваслаўным царкоўным прадпісаннем пацвярджаецца таксама патрабаваннем ужываць аброчны хлеб нашча, як прасфору, антыдор ці святую ваду. Паводле ўяўленняў носьбітаў традыцыі, прастору іх існавання падзяляла рухомая мяжа па лініі «свой – чужы». Свая, культурная прастора – гэта вёскі, у тым ліку на акупаванай тэрыторыі, па якіх «ідзе хлеб» (<…> *куды не прыдзеш, усюды пякуць. Хлеб ішоў цугам, сплашной паласой. Увесь народ памагаў*). Чужая, хтанічная прастора – гэта тэрыторыя вайны, якая звужаецца ў выніку пераможнага «наступлення хлеба» (*Дайшоў так хлеб да нямецкай граніцы, і вайна кончылася*). У беларускіх крыніцах неаднаразова сустракаюцца згадкі пра яшчэ адну самабытную форму дзеяння-абярэга – трансмісійную практыку распаўсюджання кругавых «святых пісем» (прысвечаны працы С. Сміта, В. Лур'е, А. Панчанкі, Д. Радчанкі, А. Панамаровай, С. Барысава). Разгледжаныя з'явы абрадавай культуры больш познія адносна *вырабу абыдзённіка, абворвання, апаясвання, абкурвання, захрышчвання, абыходаў,* іх актыўнае пашырэнне падчас вайны грунтуецца на ўзрастаючым рэлігійна-містычным светаадчуванні людзей. Ядро дзеянняў-абярэгаў, зафіксаваных у штодзённай культуры насельніцтва акупаваных тэрыторый Беларусі, склалі *абыходы двара, вёскі,* скіраваныя на прадухіленне спалення хаты, вёскі,

расстрэлаў, раненняў і іншых разбуральных наступстваў вайны. Даказана, што невербальныя і вербальныя формы ахоўвання, мантычныя дзеянні прымяняліся як паасобку, так і ў спалучэнні, як індывідуальна, так і калектыўна.

Аналагічныя з'явы франтавога быту значна часцей узгадваюцца ва ўспамінах сведак і ўдзельнікаў вайны (працы рускага гісторыка і фалькларыста Л. Пушкарова і інш.). Але іх інфарматыўны патэнцыял абмежаваны: гэта салдацкія павер'і, абумоўленыя вымушаным блізкім кантактам чалавека са смерцю, канстатацыя своеасаблівага «салдацкага фаталізму» і веры франтавікоў у сілу абярэгаў. Акрамя рэчаў з хрысціянскай сімволікай, на фронце, у партызанскіх злучэннях, у палоне абярэгамі нярэдка выступалі згаданыя вышэй «святыя пісьмы», фотакарткі, пісьмы родных, перапісаныя вершы лірыка-патрыятычнага зместу («Жди меня»). З'явы народнай традыцыі, накіраваныя на пераадоленне вайны, выконвалі ў грамадстве кансалідуючую, адаптыўную, кампенсаторную і рэгулятыўную функцыі.

Раздзел 3.3 **«Рэлігійна-містычныя ўяўленні аб сацыяльных катастрофах у кантэксце народнай традыцыі»** прысвечаны герменеўтычным формам народнай няказкавай прозы (прыкметы і павер'і, аповеды пра знакі-прадвеснікі бедства, народнарэлігійныя эсхаталагічныя аповеды, былічкі, тлумачэнні сноў) у кантэксце народнага ўсведамлення вайны. Беларускія матэрыялы пацвярджаюць пашырэнне ў вуснай традыцыі сярэдзіны ХХ ст. фальклорных наратываў пра «знакі бяды» і «апошнія часы», аднак колькасць іх адносна невялікая. Пры распрацоўцы тэмы ўлічаны працы В. Бяловай, М. Рыбловай, М. Пятрова, А. Ліцаравай, В. Запарожац, В. Дабравольскай, І. Бутава.

Сцверджана, што прафетычныя прыкметы і павер'і рэпрадукуюцца ў фальклоры дзякуючы такой асаблівасці калектыўнай памяці традыцыйнага грамадства, як цыклічнасць, што абумоўлена народным вопытам пражывання перыядаў бедстваў. Бедствамі для людзей з'яўляліся не толькі войны, але і голад у выніку неўраджаяў, эпідэмій, эпізаотый буйной рагатай жывёлы і інш. Гэта асэнсоўвалася ў логіцы міфалагічнай свядомасці, паводле якой кожны перыяд стабільнасці, дабрабыту, вялікая ўрадлівасць (прыплод) у будучым кампенсуюцца надзвычайнымі стратамі (смерцю/нястачай/голадам). Так, у XIX–XX стст. аповеды аб прадвесніках сацыяльных катастроф, прышэсці Антыхрыста суадносіліся з вайной 1812 г. («вайной з французам») (узгадка ў камедыі Янкі Купалы «Паўлінка», 1912). Сацыяльныя ўзрушэнні першай паловы ХХ ст., у тым ліку атэістычны ціск на сакральна-рэлігійную сферу народнага жыцця, падзеі Вялікай Айчыннай вайны прывялі да ўзнаўлення і пашырэння ў вуснай традыцыі падобных з'яў. Яны маюць устойлівую

міфасемантычную аснову і матыўна-сюжэтны фонд, які ўказвае на іх арганічную ўлучанасць ва ўсходнеславянскую фальклорную традыцыю.

Знакамі-прадвеснікамі індывідуальнага і калектыўнага лёсу выступалі прыродныя і культурныя з'явы, лакалізацыя, маштаб ці характар якіх у міфалагічнай карціне свету суадносіліся з сакральнай сферай. Гэта, па-першае, нябесныя знакі (*зацьменне сонца*, *каметы*, *праяўленыя ў небе антрапаморфныя*, *заaморфныя вобразы*, *крыжы*, *слупы* і інш.), згадкі пра іх сустракаюцца ўжо ў помніках старажытнага пісьменства. Па-другое, трансфармацыі прадметаў хрысціянскага культу (*адкрыццё* «*святых крыніц*», *міраструменне* («*плач*») *абразоў, абнаўленне абразоў і прыдарожных крыжоў*). Феномен *абнаўлення абразоў* (раптоўнае змяненне выяў на іх, якое служыць узмацненню сакралізацыі) назіраўся да сярэдзіны ХХ ст. у Беларусі, Расіі, Малдове, Польшчы, Украіне. Трэцяя група «знакаў бяды» – сустрэчы з веснікамі, пасланнікамі іншасвету ці персаніфікацыямі смерці, якія адбываюцца ў месцах магчымай сувязі чалавека са звышнатуральным (*дарога з яе семантыкай мяжы паміж «сваёй» і «чужой» прасторай, крыніцы, калодзежы і лазні як аб'екты, звязаныя з вадой і падзем'ем, могілкі*). Значная частка іх увасоблена ў аповедах на своеасаблівы вандроўны сюжэт народнай эсхаталагічнай прозы, аснову якога складае матыў «сустрэча на дарозе». Веснікамі надыходзячай вайны выступаюць стары, воўк, голая жанчына, якая просіць у чалавека купіць ёй адзенне/тканіну, жанчына ў белым/чырвоным і інш. З'яўленне вялікай колькасці істот, якія ў міфалагічнай карціне свету лакалізуюцца ў хтанічнай прасторы (*мышы*, *пацукі*, *паразіты*, *насякомыя*), таксама інтэрпрэтавалася як «знакі бяды». Паводле народных уяўленняў, на набліжэнне катастрофы ўказвалі асаблівыя паводзіны жывёл, убачаныя людзьмі прадметы, сімвалічнае значэнне якіх лёгка чытаецца (*мяшок з хлебам, труна*).

Падчас экспедыцый на Усходняе Палессе ў 1945–1946 гг. беларускімі даследчыкамі фіксаваліся аповеды з пазітыўнай прагнастычнай функцыяй (пра разгром немцаў і заканчэнне вайны) на сюжэт «Бой пеўняў». Перамога чырвонага пеўня ў іх трактавалася як перамога «нашых», «рускіх», «савецкіх» над «чужымі», «немцамі», «фашыстамі». У большасці вядомых тэкстаў хтанічны пачатак увасабляе белы певень. Чорны колер пеўня-антаганіста ў некаторых беларускіх варыянтах з'яўляецца вынікам пазнейшага пераасэнсавання, якое адбылося ў фальклорным дыскурсе пра Другую сусветную вайну.

Прагнастычны сэнс рэлігійна-містычных уяўленняў пра сацыяльныя катастрофы рэалізуецца постфактум, праз своеасаблівы зваротны працэс іх аб'ектывацыі.

У главе 4 **«Беларускі ваенны фальклор як мастацкі дыскурс»** канстатуецца, што сярод фальклорных жанраў, якія абслугоўваюць камунікатыўную сітуацыю, у шырокім сэнсе слова выкліканую вайной, дамінуе песня. Увасобленая ў мове традыцыйнай культуры народная песня ва ўсёй разнастайнасці сваіх жанравых формаў выступіла асноўным кампанентам мастацкага дыскурсу, універсальным сродкам асэнсавання суб'ектыўна-эмацыянальнага вопыту пражывання вайны. Практычна выключанымі з даследчага поля беларускай фалькларыстыкі аказаліся сюжэтна-тэматычныя цыклы лірычных песень з цэнтральнымі вобразамі параненых, медыцынскіх сёстраў, інвалідаў вайны, палонных. Іх дыскурсіўная інтэрпрэтацыя грунтуецца на канцэпцыі Ю. Эмер і ўключае апісанне ў якасці базавых сацыякультурных (фарміраванне і ўмовы бытавання), камунікатыўных (камунікатыўная сітуацыя і яе жанравае ўвасабленне) і кагнітыўных (каштоўнасныя ўстаноўкі і фальклорныя канцэпты) характарыстык і мовы.

У раздзеле 4.1 «**Траўматычны вопыт вайны ў сюжэтна-тэматычным цыкле песень пра сястру міласэрнасці»** даказана, што вобраз сястры міласэрнасці, з'яўляючыся познетрадыцыйным, не знаходзіць рэлевантных аналогій у класічным фальклоры. Трактоўка і эвалюцыя вобраза сястры міласэрнасці ў мастацкай культуры і грамадскай свядомасці разгледжаны ў працах Я. Праўдзікоўскай, А. Казлоўцавай, А. Пастарнака, Г. Срыбнай, В. Сіманавай, Ю. Івановай. Сцверджана, што ўзнікненне гэтага вобраза дэтэрмінавана сацыяльна-гістарычнымі рэаліямі XIX–XX стст., сярод якіх вызначальную ролю адыграла дзейнасць суполак Чырвонага Крыжа, у выніку чаго жанчына ўпершыню была інтэгравана ў сферу традыцыйна мужчынскай актыўнасці. У 1920–1930-я гг. вобраз медыцынскай сястры існаваў у грамадска-палітычнай прасторы савецкай краіны, рэпрэзентаваўся як аптымістычны, сацыяльна адказны, улучаны ва ўсеагульную мабілізацыю. Па-сутнасці, ён з'яўляўся антыподам вобраза сястры міласэрнасці царскага рэжыму з яе хрысціянскім саслоўна-дабрачынным служэннем.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны жанчыны-медыкі як своеасаблівы мікрасоцыум былі носьбітамі ўласнага «рэгламентаванага» песеннага рэпертуару. Яго складаліператэкстоўкі аўтарскіх песень («*Песня о сестре*», «*Медсястра Анюта*», «*Песня дружынніц*»), пашыраныя таксама, як сведчаць архіўныя матэрыялы, сярод беларускіх партызан і мірнага насельніцтва. Аднак вызначальным фактарам фарміравання сюжэтна-тэматычнага цыкла песень пра сястру міласэрнасці паслужыла актуалізацыя дарэвалюцыйнай салдацкай песні «*Па крутых гарах Карпацкіх*» на сюжэт «Сястра міласэрнасці дапамагае параненаму салдату». Прататэкстам з'яўляецца папулярны раманс часоў

Першай сусветнай вайны на верш С. Капыткіна «В полевом лазарете» (1914). У беларускіх варыянтах гэтага твора сустракаюцца фармальныя адсылкі да ваенных дзеянняў Першай сусветнай вайны (*Галіцыйская аперацыя*), грамадзянскай вайны на Далёкім Усходзе Расіі, партызанскага руху ў Забайкаллі і інш. Найбольш тыпізаванымі ў народнапесенных творах, запісаных у 1940–1950-я гг., сталі камунікатыўныя сітуацыі выражэння эмпатыі. Медсястра суправаджае байца да яго апошняга ўздыху (*папраўляе перавязкі, корміць, поіць, піша пісьмы, угаворвае пацярпець, прыбягае, чуючы стогны, моліцца перад крыжам, слухае апошнія словы*). Яна раздзяляе фізічныя і маральныя пакуты параненага (*А сама едва шагала, / Уся ізмучана была*; *Ёй на сэрцы цяжало, / Её мужа тожа ўбілі, / Сэрца кроўю абашло*).

На ўзроўні аксіялогіі фальклорны вобраз сястры міласэрнасці/медсястры ўзыходзіць да міфалагем маці, сястры, жонкі (каханай), звязаны з суцяшэннем, апекай, клопатам і рэалізуецца як антытэза вайне і смерці. У ваенны час і пазней пад уплывам гарадскога раманса і як вынік засваення ўплыву прафесійнага мастацтва ў семантыцы вобраза развіваюцца лірычныя матывы кахання і вернасці, але яны не з'яўляюцца дамінуючымі.

У раздзеле 4.2 **«Трагедыя ранення і інваліднасці ў салдацкай лірыцы: сацыяльна-псіхалагічны вопыт і формы выражэння»** паказана, што ў масавай культуры ваенны інвалід як асаблівы ў сацыяльным плане тып быў сфарміраваны ў канцы XIX – пачатку XX ст. Войны XX в. спарадзілі сацыяльную праблему салдата-інваліда як *homo patiens*. У Вялікую Айчынную вайну маштабы раненняў і інваліднасці, людскія страты ваеннаслужачых, паводле сучаснай ваенна-медыцынскай статыстыкі, былі велізарныя. Пасля вайны лёс многіх дэмабілізаваных інвалідаў склаўся трагічна. Менавіта таму песні пра інвалідаў як частка салдацкай лірыкі пашырыліся за межы бытавання ў сваёй «прафесійнай групе» і ўвайшлі ў папулярны рэпертуар гарадскога фальклору. Асобныя аспекты тэмы разгледжаны ў працах У. Чычарава, А. Сяняўскай, М. Строганава, Ж. Карміной, М. Мураўёвай, К. Сене.

Адным з першых «калека-солдат изнуренный» як вобраз з'явіўся ў папулярнай гарадской песні часоў Руска-японскай вайны «*От павших твердынь Порт-Артура*» (верш Т. Шчэпкінай-Куперхнік «На Родине» (1906) на мелодыю «По диким степям Забайкалья»). Пазней ён стаў цэнтральным вобразам песень пра героя-інваліда Вялікай Айчыннай вайны («*Адпраўка з германскага фронту*»). Акрамя матываў разбурэння сялянскай сям'і і артыкуляванай інваліднасці героя (*Лішыўся ён воляю рока / Карміліцы – правай рукі*), пад уплывам жанравай эстэтыкі гарадскога раманса ў названым і іншых творах развіліся новыя сюжэтныя лініі, абумоўленыя матывамі здрады,

праверкі каханай на вернасць, помсты і маральнага асуджэння здрады («*Капітан*»/«*Раскажу я вам случай забаўны*» і вытворная ад яе «*Ковыляй потихонечку*»). Тут назіраецца характэрная інверсія традыцыйнай гісторыі пра каханне і здраду, у якой ахвярай лёсу аказваецца не дзяўчына, а мужчына-інвалід. Недавер да шлюбнага партнёра ў салдацкай песні часта процістаўляецца моцнай сувязі са сваім родам, якая дазваляе чалавеку-інваліду сацыяльна кампенсавацца (*Ох, мама, у цяжкую муку / Нанес я урон урагу. / Аставіў я левую руку, / Аставіў урагу на вайне. // Я драўся як воін з урагом, / Ардзеноў я сумеў заслужыць, / Астаўшыся з правай рукою, / Сумею я маць пракарміць*). Падобныя творы, увасобленыя пераважна ў познетрадыцыйных рамансава-баладных формах, складаюць асноўную долю сярод тэкстаў гэтай тэматыкі («*Ой, у полі стаіць хатына*», «*Успомні, мама дарагая*», «*У горад Горкі на вуліцу Дружбы*» і інш.). Яны зафіксаваны пераважна на Міншчыне ў 1940–1950-я гг. Найбольш поўны тэкст гарадскога раманса-ламентацыі з цэнтральным вобразам інваліда «*Не пара ль, дарагая, растацца*», які ўзыходзіць да жорсткага раманса часоў Першай сусветнай вайны «На Варшавском на главном вокзале», быў запісаны беларускім фалькларыстам А. Гурскім у 1960 г. на Віцебшчыне з пазнакай «*песня часоў імперыялістычнай вайны*».

Інваліднасць, набытая на вайне, як канцэпт традыцыйнай культуры сфарміраваны даволі позна і семантычна блізкі *ўвечнасці*, *калецтву* ў сялянскім фальклоры, але не тоесны ім, бо не мае міфалагічнай напоўненасці (дэманічная прырода носьбіта ці сувязь з іншасветам, валоданне магічнымі практыкамі і інш.). Інвалід вайны ў мастацкім дыскурсе ваеннага фальклору існуе ў новай сацыякультурнай прасторы, прадметам яго мастацкай рэфлексіі з’яўляецца стыгматызацыя асобы. Сутнасць інваліднасці вызначаецца не саматыкай, а сацыяльна-асобасным аспектам: разрывам сацыяльных сувязей, дэзынтэграцыяй, сімптомам калектыўнай траўмы.

Раздзел 4.3 **«Гістарычная рэальнасць і народнапаэтычная традыцыя ў песнях палонных»** прысвечаны асэнсаванню палону як сацыяльнай рэальнасці і таму ўнікальнаму тыпу бытавой культуры, які сфарміраваўся падчас Другой сусветнай вайны і выразіўся ў самабытнай жанрава-тэматычнай групе твораў (песень, вершаў, парэмій, засцерагальных практык, павер’яў, этыкетных формул паштовай перапіскі і інш.). Яны маркіруюць калектыўную ідэнтычнасць остарбайтараў і палонных-нявольнікаў. Асобныя аспекты духоўнага свету, субкультуры ўсходніх рабочых і ваеннапалонных, іх штодзённасці і фальклору асветлены ў працах К. Чыстова, П. Паляна, Г. Грынчанкі, І. Рабровай, А. Кузьменкі. Па беларускай праблематыцы

арыенцірам служыць трохтомны зборнік дакументаў і матэрыялаў «Белорусские остарбайтеры: угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию, 1941–1944» (уклад. Г. Кнацько). Падкрэслена навуковая каштоўнасць фальклорных матэрыялаў Л. Барага, М. Меяровіч, М. Грынблата, якія ў 1945 і 1946 гг. запісвалі песні непасрэдна ад рэпатрыянтаў ці з іх альбомаў, дзённікаў. Сёння гэта дазваляе пераадолець пэўны схематызм трактовак фальклору палонных і пашырыць наша ўяўленне пра «некананічныя» тэксты ваеннага часу.

У песнях палонных увасоблены стан, досвед і рэфлексія чалавека, пазбаўленага свабоды падчас вайны шляхам дэпартацыі, знаходжання ў палоне, у месцах масавага прымусовага ўтрымання (перасыльных, працоўных лагерах, канцлагерах). У пераважнай большасці гэта ператэкстоўкі, зыходнымі тэкстамі якіх служылі творы афіцыйнага дыскурсу (папулярныя песні і вершы 1930–1940-х гг.), узоры дарэвалюцыйных арыштанцкіх, турэмных і савецкіх лагерных песень, класіка сялянскага фальклору (сюжэты рэкруцкіх, сямейна- і сацыяльна-бытавых песень).

Сцверджаны ў савецкай навуцы і публіцыстыцы тэзіс пра дамінуючую ў ваенным фальклоры гендарную рэпрэзентацыю палоннага як дзяўчыны абвяргаецца наяўнасцю не толькі «жаночых», але і «мужчынскіх» варыянтаў вядомых твораў: «*На пам'ять "Ost"*» (ператэкстоўка песні «*Синий платочек*»), «*Тучы над лагерам сталі*», «*Я жыву бліз Ахоцкага мора*», «*Галава ль ты мая ўдалая*». Распаўсюджанай у рэпертуары нявольнікаў стала ператэкстоўка папулярнай дарэвалюцыйнай песні «*Горит свеча, в вагоне тихо*» (песеннае гняздо складаюць салдацкія, матроскія, казацкія, партызанскія версіі розных часоў). Устойлівая формула фальклорнай паэтыкі *Ах, мама, маменька радная, / Зачым на свет ты радзіла, / Судзьбой няшчаснай наградзіла, / У страну фашызма аддала?* з'яўляецца вынікам пераасэнсавання традыцыйнага матыву сірочай песні. Ператэкстоўкі рэкруцкіх песень «*Каліна-маліна*», «*Забрукуй, сівы галубочак*», песні-жальбы замужніцы «*Ой, жураўка, жураўка*» характарызуюцца ўстойлівасцю матываў успамінаў пра маці, бацькоўскі дом, родную старану з вобразамі бяссонніцы, слёз, зарослай дарожкі, канстатацыі даўнасці разлукі і інш. Матывы-сітуацыі і матывы-апісанні з вялікай семіятычнай напоўненасцю («смерць на чужыне», «смерць без пахавання», «закінутая магіла») развіваюцца ў самастойныя мадэрнізаваныя сюжэты прадбачання (чакання) смерці на чужыне.

Прадметам мастацкай рэфлексіі ў песнях палонных выступае сацыяльна-асобасны аспект няволі і персанальны траўматычны вопыт, звязаны з пачуццямі страху, суму, трывогі, болю, прыніжэння, безвыходнасці. Сюжэтна-стылявую

адметнасць складаюць малюнкі лагернага жыцця: рэжыму ўтрымання, распарадку дня, формаў прымусу да працы, нормаў выпрацоўкі і харчавання, якасці ежы і такога псіхасаматычнага аспекту зняволеных, як устойлівае адчуванне голаду. Песні остарбайтараў і палонных – пераважна рэалістычныя праекцыі трагічнай штодзённасці. Спецыфіка камунікатыўных сітуацый бытавання адзначанай групы фальклорных твораў заключаецца ў больш актыўным, у параўнанні з песнямі іншых жанравых груп, бытаванні ў пісьмовай форме.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

## Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

Праведзенае ўпершыню комплекснае даследаванне беларускага ваеннага фальклору дазволіла зрабіць наступныя высновы:

1. Гісторыя вывучэння беларускага ваеннага фальклору пачынаецца на этапе *класічнага нарадазнаўства* (сярэдзіна XIX ст. – 1920-я гг.). Найбольш грунтоўна рэкруцкая і салдацкая песні прадстаўлены ў «Беларускім зборніку» Е. Раманава (Вып. 1–2, 1885). У пачатку XX ст. адбываецца паступовае адчужэнне падобных твораў ад навуковай парадыгмы, што грунтуецца на ўсталяванай у нарадазнаўстве трактоўцы беларусаў як грамадства аграрнага тыпу, негатыўнай ацэнцы новых з’яў у народнай творчасці і ігнараванні фактараў уплыву на яе розных сацыяльных груп (такіх пазіцый прытрымліваліся Е. Раманаў, Я. Карскі, М. Янчук, А. Шлюбскі). Адсутнасць у полі зроку фалькларыстаў фактаў народнай традыцыі, у якіх увасоблены калектыўны вопыт перажывання войнаў і нясення вайсковай службы, абмяжоўвала магчымасці навуковай інтэрпрэтацыі фальклору Вялікай Айчыннай вайны.

*Савецкі этап (1930–1980-я гг.).* З 1930-х гг. ваенны фальклор уваходзіць у фокус даследчыцкай увагі, паколькі фалькларысты і дзеячы культуры Беларусі далучаюцца да санкцыянаванага ўладай пошуку і рэпрэзентацыі ўзораў народнага сацыялістычнага мастацтва. Падчас Вялікай Айчыннай вайны сфарміраваўся ўнікальны пласт беларускай народнай творчасці. З 1945 па 1962 г. адбыліся найбольш плёныя экспедыцыі беларускіх вучоных і дзеячаў культуры Л. Мухарынскай, М. Меяровіч, Л. Барага, М. Грынблата, Р. Шырмы, І. Гутарава, Г. Цітовіча, М. Клімковіча, І. Даўгялы і інш., вынікам якіх стала стварэнне фонду фальклорных матэрыялаў, зафіксаваных на стадыі актыўнага бытавання ваеннага фальклору. Збіральніцкая дзейнасць фалькларыстаў

і дзеячаў культуры гэтага перыяду з’яўляецца эпахальнай старонкай гісторыі беларускай фалькларыстыкі XX ст.

На *постсавецкім этапе* інтэрпрэтацыі беларускага ваеннага фальклору даюцца ў ракурсах, выпрацаваных у савецкі час, на аснове класічных тэкстаў пераважна песенных жанраў з гісторыка-публіцыстычным, краязнаўчым і аўтабіяграфічным каментаваннем (работы А. Фядосіка, Г. Барташэвіч, Г. Пятроўскай, А. Гурскага, Л. Луц (Нямковай), А. Цітаўца). У 2000-я гг. з’явы вуснай народнай традыцыі, звязаныя з вайной, не выступаюць аб’ектам эскпедыцыйнай работы і тэарэтычных даследаванняў, у выніку чаго навуковы дыскурс па дадзенай тэме застаецца сфарміраваным часткова. Беларускі ваенны фальклор захоўвае вялікі патэнцыял для наступных пакаленняў айчынных фалькларыстаў [5–А; 8–А; 10–А; 24–А; 26–А].

2. З 1930-х гг. у тэорыі і збіральніцкай практыцы беларускай фалькларыстыкі сцвярджаецца метад сацыялістычнага рэалізму, скіраваны на канструяванне і легітымізацыю новай савецкай ідэнтычнасці, у кантэксце чаго ўстаноўка на народную творчасць была выключна прадуктыўнай. Стратэгіі далучэння актараў навуковага дыскурсу (акадэмічных калектываў, асобных даследчыкаў, збіральнікаў, самадзейных выканаўцаў і інш.) уяўлялі сабой разнастайныя формы кампрамісу паміж навукай, носьбітам фальклору, масавым адрасатам савецкай культуры і ўладай. Фармальным пачаткам канструявання канона беларускага ваеннага фальклору лічыцца пастаноўка задач яго збірання і вывучэння на Спецыяльнай усесаюзнай нарадзе ў ІЭ АН СССР (1947), а фактычным завяршэннем – акадэмічны зборнік «Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны» (ІМЭФ АН БССР, 1961). *Канон беларускага ваеннага фальклору* – тэксты (узоры прафесійнай, аматарскай творчасці, пераклады, у меншай ступені – аўтэнтычныя творы), навуковыя каментарыі і крытыка (К. Крапіва, М. Лынькоў, Э. Агняцвет і інш.), звязаныя пераважна з Вялікай Айчыннай вайной, якія рэпрэзентуюць спецыфічную гісторыка-гераічную праекцыю яе падзей, акцэнтуючы ўвагу на героіка-патрыятычным пафасе [6–А; 7–А; 20–А].

3. *Беларуская ваенная песня* трактуецца як гістарычна і сацыяльна абумоўленая форма функцыянавання вуснай традыцыі (з XVI–XVII па XXI ст.), вынік узаемадзеяння розных этнічных традыцый і тыпаў культуры (традыцыйнай, масавай, афіцыйнай) і вызначаецца як *частка беларускай этнакультурнай спадчыны, музычна-паэтычныя тэксты вуснай і пісьмовай формаў бытавання, у якіх адлюстравана вайна як сацыяльна-асобасная падзея, вербалізаваны эмацыянальна-эстэтычны і практычны вопыт вайны ці вайсковай штодзённасці.* Маючы разнастайнае функцыянальнае прызначэнне,

ваенныя песні беларусаў існуюць у ранне- і познетрадыцыйных жанравых формах (балада, лірычная пазаабрадавая песня, гарадскі раманс, гарадская песня, «раманс-ламентацыя», прыпеўка і інш.), формах карпаратыўнай (вайсковай) песеннай творчасці (хронікі, паходныя/маршавыя песні, песні акопнага быту, песні пра «айцоў-камандзіраў»), пералажэннях (ператэкстоўках).

У вуснай народнай традыцыі беларусаў прадуктыўна разгортваецца працяглая гісторыя бытавання песень (XVIII – пачатак XXI ст.), што дае падставы для высноў аб працэсах фальклaрызацыі як спосабе засваення народнай песняй новага мастацкага зместу. *Фальклaрызацыя* – уключэнне прафесійных/аўтарскіх твораў у фальклорную культуру ці засваенне ўжо існуючай фальклорнай адзінкай новага культурнага зместу, вынікам чаго з’яўляецца *ператэкстоўка*. Па ступені трансфармацыі прататэксту ў народнай ваеннай песні вылучаюцца *ператэкстоўка-рэдакцыя, ператэкстоўка-перакадзіроўка*, *ператэкстоўка-перасемантызацыя.* Вектарам фальклaрызацыі служыць рэдукцыя эпічнага і павелічэнне лірычнага пачатку (развіццё суб’ектнасці героя, індывідуалізацыя, дэталізацыя і гіпербалізацыя яго перажывання), што прыводзіць да дамінавання ў ваеннай песні XX ст. рамансавых формаў, якія перадаюць драматызм сутыкнення чалавека з ваеннай рэчаіснасцю [2–А, 3–А, 4–А; 12–А; 28–А, 29–А, 31–А].

4. Фальклорныя экспедыцыі Л. Барага і М. Меяровіч 1943, 1945–1946 гг. выявілі маштабную прысутнасць у вуснай традыцыі авантурна-прыгодніцкіх аповедаў з цэнтральным вобразам партызана-чыгуначніка, аднаго з камандзіраў партызанскага руху на тэрыторыі БССР К. С. Заслонава (1910–1942). Канстанцін Заслонаў – значны элемент персанажнага кода савецкай героікі, мемарыялізацыя якога пачалася ў 1943 г. Яго фальклорны вобраз («дзядзя Косця») увасоблены пераважна ў тэкстах няказкавай прозы з выразнымі рысамі гістарычнага падання. «Заслонаўскі» сюжэт «Партызанскі камандзір дзейнічае ў нямецкім тыле» з’яўляецца тэкстуалізацыяй вядомага ў беларускім фальклоры эпічнага сюжэта «Платаў як невядомы госць француза» (падзеі вайны 1812 г.), які, у сваю чаргу, узыходзіць да ранняй усходнеславянскай эпічнай традыцыі. Гэта даказана ўстойлівасцю асноўных матываў («маскаванне героя», «вайсковая хітрасць», «пранікненне ў стан праціўніка», «асмяянне праціўніка») і наяўнасцю архаічных эпічных матываў («узнаванне цара па адзнаках», «вяртанне збавіцеля»/«уваскрасенне героя» (Васіль Іванавіч Чапаеў)). Вобраз «айца-камандзіра» Заслонава надзелены функцыямі культурнага героя – аднаўляць парушаную справядлівасць/сацыяльны парадак, бараніць племя/дзяржаву ад ворагаў,

служыць «народнапаэтычным абагульненнем» геройскай адвагі і тактычнай перамогі над ворагам [17–А; 22–А; 23–А].

5. Вылучаная гіпотэза пра бытаванне ў Цэнтральнай Беларусі і ў зонах беларускага і ўкраінскага Палесся такога самабытнага каляднага ігрышча, як «вайсковы абыход», грунтуецца на экспедыцыйных матэрыялах 1956 г. з Гомельшчыны і фактах усходнеславянскай абрадавай традыцыі, выяўленых аўтарам у гісторыка-літаратурных, этнаграфічных і мовазнаўчых працах. «Вайсковыя абыходы» сталі вынікам пранікнення ў сялянскі побыт у сярэдзіне XIX – пачатку XX ст. культуры салдацкага асяроддзя (войскі Расійскай імперыі ў беларускіх губернях), найперш паратэатральнай з’явы пад назвай «салдацкі тэатр». Па сваёй сутнасці «вайсковыя абыходы» з’яўляюцца мадэрнізаванай (рухомай) формай стацыянарнай народнай драмы. На ўзроўні вербальнага, акцыянальнага, атрыбутыўнага і персанажнага кодаў іх вызначаюць элементы распаўсюджанай у салдацкім асяроддзі народнай драмы «Цар Максімільян», кантамінаваныя з гульнёва-драматызаванымі дзеямі «ваджэння казы». Найбольш поўна змест «вайсковых абыходаў» сёння рэпрэзентуе семежаўскі абрад «Калядныя Цары» [1–А; 16–А].

6. Выражанае ў фальклоры народнае ўсведамленне вайны як разбурэння традыцыйнай карціны свету грунтуецца на экзістэнцыйным вопыце перажывання пакаленнямі беларусаў сацыяльных катаклізмаў (войнаў, голаду, эпідэмій). У міфасемантыцы фальклору канкрэтна-гістарычнага перыяду Вялікай Айчыннай вайны вызначана дыхатамія міфалагем *жыццё – смерць*, праяўленая ў славесных, славесна-музычных і абрадавых тэкстах як *мір – вайна*, *радзіма – чужына*, *свой – чужы/вораг/заваёўнік*, *свабода – акупацыя/палон*, *ахвяра – кат*; доказана засваенне новых для традыцыйнай культуры міфалагем (*подзвіг, самаахвярнасць*, *савецкі патрыятызм*); прасочана развіццё персанажаў, матываў і сюжэтаў новай героікі вакол фальклярызаваных (*Зоя Касмадзям’янская*, *Пётр Дзьякаў*, *Канстанцін Заслонаў*, *Чапаеў* і інш.) і абагульненых (*салдат*, *камандзір*, *партызан*) вобразаў герояў – ахвяр і герояў – народных заступнікаў. Міфасемантыку «ахоўных механізмаў» фальклорнай традыцыі, якімі выступаюць калектыўныя і індывідуальныя практыкі абракання (*выраб абыдзённых прадметаў*, *выпяканне і распаўсюджанне хлеба*, *перапісванне кругавых «святых пісем»*, *«спраўленне свячэй»*), сімвалічнага закрыцця аб’екта (*абыходы двара і вёскі*, *захрышчванне*), універсальных дзеянняў-абярэгаў (*маленне*, *замаўленне*, *ахвяраванне*, *выкарыстанне рэчаў-абярэгаў* і інш.), а таксама міфасемантыку прафетычных і апакаліптычных аповедаў пра «знакі бяды» вызначаюць архаічныя народнарэлігійныя ўяўленні, перакадзіраваныя ў адпаведнасці з рэаліямі

ваеннага часу. Яны праяўляюцца як ментальныя і акцыянальныя апеляцыі да вышэйшых сіл з мэтай прадбачання, засцеражэння, абароны ад наступстваў вайны. Знакамі-прадвеснікамі індывідуальнага і калектыўнага лёсу выступаюць прыродныя і культурныя з'явы, лакалізацыя, маштаб ці характар якіх у міфалагічнай карціне свету суадносіцца з сакральнай або хтанічнай сферай [9–А; 13–А; 14–А; 21–А; 25–А; 27–А; 32–А].

7. Ваенны фальклор як частка нацыянальнай культуры адыгрывае асаблівую ролю ў фарміраванні этнічнай карціны свету, узнаўляючы ўстаноўкі калектыўнай свядомасці ў іх культурна-эстэтычным праяўленні. Разгледжаны як мастацкі дыскурс, ён акрэсліваецца *абумоўленай ваенна-гістарычнымі ўмовамі сярэдзіны XIX – XX стст. знакава апасродкаванай камунікацыяй, асноўным кампанентам якой выступае традыцыйны тэкст*. Камуніканты дыскурсу складаюць гетэрагеннае асяроддзе (*носьбіты фальклорнай свядомасці* і *прадстаўнікі асяроддзя, культура якога вызначаецца пісьмовай традыцыяй*) з пэўнай этнакультурнай і сацыяльнай стратыфікацыяй, прадстаўленае ў мікрасоцыумах (*франтавікі, партызаны, медыкі, палоныя, остарбайтары, параненыя ў шпіталях* і інш.), у якіх узоры ваеннага фальклору служаць канвенцыйнымі формамі камунікацыі. Гэта праяўляецца як дыскурсіўна абумоўленая поліфанія ваеннага фальклору – здольнасць засвойваць элементы іншых дыскурсаў, а таксама быць уключаным у іншыя дыскурсы. Эматыўная, мастацкая, рэгулятыўная функцыі фальклорных твораў рэалізуюцца ў неапасродкаваных (*міжасабовых* і *індывідуальных, святочных* і *паўсядзённых*) і апасродкаваных камунікатыўных сітуацыях (*засваенне праз друкаваныя выданні, лістоўкі, пісьмы, песеннікі, узнаўленне на механічных прыладах, трансляцыі па радыё*).

Семантычныя параметры ваеннага фальклору вызначае асэнсаванне рэалій вайны ў межах традыцыйнасці праз сукупнасць абагульненых культурна значных сэнсаў, уяўленняў і маральна-этычных установак. Дыскурсаўтваральнымі канцэптамі выступаюць міфалагемы *жыццё, смерць, вайна, доля, чужына, салдат, дом, маці*. У ваенным фальклоры фарміруецца іх новая дыскурсіўная рэалізацыі – *савецкая радзіма, баявы/маральны подзвіг, вораг-фашыст, камандзір, партызан/партызанка, медсястра/жанчына-суцяшальніца, інвалід вайны, остарбайтар, палон/лагер*. Мова ваеннага фальклору характарызуецца абагульненасцю семантыкі, асацыятыўнасцю, дамінаваннем сродкаў фальклорнай паэтыкі, сюжэтнай формульнасцю, што вызначана характарам удзельнікаў дыскурсу, якія ў пераважнай большасці былі носьбітамі фальклорнай традыцыі [1–А; 11–А; 15–А; 18–А; 19–А].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання служаць тэарэтычнай базай для далейшага вывучэння беларускага фальклору XX ст., неабходныя пры перавыданні і складанні слоўнікаў і даведнікаў, а таксама пры падрыхтоўцы прац па гісторыі беларускай навукі. Фальклорна-этнаграфічны і гісторыка-культурны матэрыял дысертацыі запатрабаваны ў вучэбным працэсе па гуманітарных дысцыплінах ва ўстановах вышэйшай адукацыі (стварэнне падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў і лекцыйных курсаў).

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

### Манаграфія

1–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Беларускі ваенны фальклор: эвалюцыя, міфасемантыка, паэтыка / Н. А. Гулак. – Мінск : РІВШ, 2022. – 240 с.

### Артыкулы ў выданнях, рэкамендаваных ВАК, і ў замежных рэцэнзаваных выданнях

2–А. Гулак (Шэйбак), Н. Да праблемы асэнсавання фальклору ваеннага часу / Н. Гулак // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні : зб. навук. прац / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларус. культуры, мовы і літаратуры, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; [рэдкал.: Т. В. Валодзіна (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск, 2019. – Вып. 6. – С. 184–194.

3–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Баладны сюжэт пра вяртанне салдата: тэкстуалізацыя і трасфармацыя матыўнага фонду / Н.А. Гулак // Журнал Белорус. гос. ун-та. Филология. – 2019. – № 1. – С. 83–91.

4–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Крыніцы фарміравання паэтычнай семантыкі партызанскіх песень Беларусі / Н. А. Гулак // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; [навук. рэд. А. І. Лакотка]. – Мінск, 2019. – Вып. 26. – С. 212–217.

5–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Дзейнасць савецкіх устаноў па вывучэнні фальклору Вялікай Айчыннай вайны (1941–1960 гг.) / Н. А. Гулак // Весці Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2019. – Т. 64, № 4. – С. 466–474.

6–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Беларуская фалькларыстыка ў кантэксце ідэй і практыкі сацрэалізму / Н. А. Гулак // Доклады Нац. акад. наук Беларуси. – 2019. – Т. 63, № 5. – С. 633–640.

7–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Самадзейная творчасць як самарэпрэзентатыўная практыка савецкай культуры 1930–1960-х гг. / Н. А. Гулак // Журнал Белорус. гос. ун-та. Филология. – 2019. – № 2. – С. 93–101.

8–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Праблемы практычнай тэксталогіі фальклору ў акадэмічнай навуцы 1960–1970-х гг. / Н. А. Гулак // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; [навук. рэд. А. І. Лакотка]. – Мінск, 2020. – Вып. 27. – С. 251–257.

9–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Праекцыя масавай песні часоў вайны ў матэрыялах экспедыцыі М. Грынблата 1945 г. / Н. А. Гулак // Журнал Белорус. гос. ун-та. Филология. – 2020. – № 1. – С. 67–73.

10–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Масавая самадзейная творчасць Беларусі 1940–1950-х гг. у кантэксце дыялогу з соцыумам / Н. А. Гулак // Известия Гомельского гос. ун-та им. Ф. Скорины. Гуманитар. науки. – 2020. – № 1 (118). – С. 89–93.

11–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Рэпрэзентацыя вобраза сястры міласэрнасці ў народнапесеннай творчасці аб вайне / Н. А. Гулак // Białorutenistyka Białostocka. – 2020. – Т. 12. – S. 399–416.

12–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Фалькларызацыя паэтычнага тэксту ў народнапесеннай традыцыі гадоў вайны / Н. А. Гулак // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; [навук. рэд. А. І. Лакотка]. – Мінск, 2020. – Вып. 28. – С. 268–274.

13–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Аброчны рытуал «хаджэнне хлеба»: міфасемантыка і культурны кантэкст / Н. А. Гулак // Весці Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2020. – Т. 65, № 4. – С. 467–475.

14–А. Гулак (Шэйбак), А. А. Персонажи советской героики в белорусском фольклоре войны / А. А. Гулак // Вестн. слав. культур. – 2021. – № 62. – С. 152–165.

15–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. «Нефарматныя» людзі і песні вайны / Н. А. Гулак // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні : зб. навук. прац / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларус. культуры, мовы і літаратуры, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; [рэдкал.: Т. В. Валодзіна (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск, 2021. – Вып. 8. – С. 115–135.

16–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Жанравая трансфармацыя народнай драмы ў прасторы абрадавай культуры / Н. А. Гулак // Весці Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2022. – Т. 67, № 1. – С. 80–87.

17–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Беларуская эпічная спадчына Другой сусветнай вайны: платаўскі сюжэт / Н. А. Гулак // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні : зб. навук. прац / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; [рэдкал.: Т. В. Валодзіна (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск, 2022. – Вып. 9. – С. 11–29.

18–А. Гулак (Шэйбак), А. А. Культурная рэпрэзетацыя траўматычнага дыскурсу няволі ў песнях палонных / А. А. Гулак // Традиционная культура. – 2022. – Т. 23, № 3. – С. 60–70.

**Артыкулы ў навуковых і навукова-метадычных зборніках**

19–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Фальклор перыяду Вялікай Айчыннай вайны: народнапесенны дыскурс (матэрыял аўтарскай лекцыі як аснова рэалізацыі стратэгіі крытычнага мыслення) / Н. А. Гулак // Філалагічная адукацыя : навук.-метад. зб. / Беларус. дзярж. ун-т ; [рэдкал.: А. І. Бельскі (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск, 2019. – Вып. 3. – С. 40–49.

20–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Фальклор савецкай эпохі: стратэгія кампрамісу ў афіцыйным дыскурсе / Н. А. Гулак // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; [гал. рэд. А. І. Лакотка]. – Мінск, 2021. – Вып. 2. – С. 454–458.

**Артыкулы ў навукова-асветніцкіх і літаратурна-мастацкіх часопісах**

21–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Песня ваенных гадоў як прадмет навуковага даследавання / Н. А. Гулак // София : электрон. науч.-просвет. журн. – 2017. – № 2, ч. 2. – С. 71–82.

22–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Даследчыя задачы і вопыт беларускай фалькларыстыкі 1945–1960-х гг. / Н. А. Гулак // София : электрон. науч.-просвет. журн. – 2019. – № 2. – С. 22–27.

23–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Незабытыя імёны беларускай фалькларыстыкі / Н. А. Гулак // Полымя. – 2020. – № 10. – С. 133–143.

24–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Асоба і дзейнасць М. Грынблата ў кантэксце гісторыі беларускай савецкай фалькларыстыкі / Н. А. Гулак // София : электрон. науч.-просвет. журн. – 2022. – № 2. – С. 9–14.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

25–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Народныя песні часоў вайны: праблемы асэнсавання / Н. Гулак // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе : сб. науч. ст. по матер. II Междунар. науч. конф., Пинск, 24–25 нояб. 2017 г. / Полес. гос. ун-т ; [под ред. Р. Б. Гагуа]. – Пинск, 2017. – С. 22–28.

26–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Самадзейная творчасць часоў вайны ў кантэксце фалькларыстыкі / Н. А. Гулак // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе : сб. науч. ст. по матер. III Междунар. науч. конф., Пинск, 30 нояб. – 1 дек. 2018 г. / Полес. гос. ун-т ; [под ред. Р. Б. Гагуа]. – Пинск, 2018. – С. 340–345.

27–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Баладны сюжэт пра подзвіг лётчыка / Н. А. Гулак // Пространство фольклора, литературы и педагогики : материалы

междунар. науч.-практ. конф. «Юдинские чтения – 2018», Курск, 6–7 дек. 2018 г. / Кур. гос. ун-т ; [редкол.: М. А. Лукина (отв. ред.) и др.]. – Курск, 2019. – С. 45–48.

28–А. Гулак (Шэйбак), А. А. Гоп со смыком на фронте: неподцензурные сюжеты в народной песне Великой Отечественной войны / А. А. Гулак // Рябининские чтения – 2019 : материалы VIII конф. по изучению и актуализации культур. наследия Рус. Севера, Петрозаводск, 23–28 сент. 2019 г. / Карел. науч. центр, Гос. ист.-архитектур. и этногр. музей-заповедник «Кижи». – Петрозаводск, 2019. – С. 363–366.

29–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Рэпрадукцыя сюжэту часоў грамадзянскай вайны ў народнапесеннай традыцыі Беларусі / Н. А. Гулак // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе : сб. науч. ст. по матер. IV Междунар. науч.-практ. конф., Пинск, 20–21 дек. 2019 г. / Полес. гос. ун-т ; [редкол.: К. К. Шебеко и др.]. – Пинск, 2019. – С. 174–177.

30–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Песня аб прызыве ў войска: ракурс дыяхраніі / Н. А. Гулак // Женщины-ученые Беларуси и России : материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 26–27 марта 2021 г. / Белорус. гос. ун-т ; [редкол.: И. В. Казакова (отв. ред.) и др.]. – Минск, 2021. – С. 77–82.

31–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Дынаміка сюжэта салдацкай песні XIX ст. у сучаснай вуснай традыцыі / Н. А. Гулак // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : матэрыялы XIII Міжнар. навук. канф., прысвеч. 100-годдзю БДУ і 90-годдзю з дня нараджэння чл.-кар. НАН Беларусі праф. А. А. Лойкі, Мінск, 28–29 кастр. 2021 г. / Белорус. гос. ун-т ; [рэдкал.: С. А. Важнік (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск, 2021. – С. 161–164.

32–А. Гулак (Шэйбак), Н. А. Паэтычны цыкл Янкі Купалы «Песні вайны» ў кантэксце вуснай народнай традыцыі / Н. А. Гулак // Мова – літаратура – культура : матэрыялы X Міжнар. навук. канф., прысвеч. 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, Мінск, 29–30 вер. 2022 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; [рэдкал.: А. І. Бельскі (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск: БДУ, 2022. – С. 18–22.

# РЭЗЮМЭ

Шэйбак Настасся Анатольеўна

**Беларускі ваенны фальклор XX ст.: эвалюцыя, міфасемантыка, спецыфіка мастацкага дыскурсу**

**Ключавыя словы:** беларускі ваенны фальклор, фалькларыстыка, фалькларызацыя, міфасемантыка, мастацкі дыскурс, сацыялістычны рэалізм, гістарызм, абрадавая практыка, матыў, сюжэт.

**Мэта даследавання** – вызначэнне сацыяльна-гістарычнай прыроды і ідэйна-мастацкага зместу беларускага ваеннага фальклору XX ст.

Комплексны падыход да вывучэння заяўленай праблемы абумовіў **метадалогію даследавання**, асновай якой з'яўляюцца храналагічны, культурна-гістарычны, гісторыка-генетычны, структурна-семіятычны метады ў спалучэнні з фалькларыстычным, дыскурсіўным і кантэкстуальным аналізам традыцыйнага тэксту.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** Упершыню даследаваны развіццё і ідэйна-мастацкая прырода ваеннага фальклору XX ст. як часткі этнакультурнай спадчыны беларусаў; пашырана даследчае поле беларускай фалькларыстыкі ў выніку ўвядзення ў навуковы ўжытак новых аўтэнтычных тэкстаў. Апісана гісторыя вывучэння ваеннага фальклору з улікам гістарычных, сацыякультурных і ідэалагічных фактараў уплыву; выяўлена значэнне метаду сацыялістычнага рэалізму для беларускай фалькларыстыкі 1930–1980-х гг. Упершыню на матэрыяле найбольш рэпрэзентатыўных песенных твораў распрацавана паняцце фалькларызацыі як спосабу засваення вуснай народнай традыцыяй новага мастацкага зместу. Раскрываецца жанравая спецыфіка і міфасемантыка з'яў ваеннага фальклору, якія раней заставаліся на перыферыі навуковай рэфлексіі (гістарычныя паданні, герменеўтычныя формы народнай прозы, абрадавыя практыкі).

**Рэкамендацыі па выкарыстанні.** Тэарэтычныя палажэнні і тэкставы матэрыял дысертацыі могуць выступаць тэарэтыка-метадалагічнай і фактычнай базай пры далейшай распрацоўцы шэрага праблем фалькларыстыкі, гісторыі беларускай навукі XX ст., падрыхтоўцы даведнікаў і энцыклапедый. Вынікі дысертацыі могуць укараняцца ў вучэбны працэс па гуманітарных дысцыплінах у вышэйшай школе.

**Галіна прымянення.** Фалькларыстыка, гісторыя Беларусі, культуралогія.

# РЕЗЮМЕ

Шейбак Анастасия Анатольевна

## Белорусский военный фольклор XX в.: эволюция, мифосемантика, специфика художественного дискурса

**Ключевые слова**: белорусский военный фольклор, фольклористика, фольклоризация, мифосемантика, художественный дискурс, социалистический реализм, историзм, обрядовая практика, мотив, сюжет.

**Цель** исследования – определение социально-исторической природы и идейно-художественного содержания белорусского военного фольклора XX в.

Комплексный подход к изучению заявленной проблемы обусловил **методологию исследования**, в основе которой лежат хронологический, культурно-исторический, историко-генетический, структурно-семиотический методы в сочетании с фольклористическим, дискурсивным и контекстуальным анализом традиционного текста.

**Полученные результаты и их новизна.** Впервые исследованы развитие и идейно-художественная природа военного фольклора XX в. как части этнокультурного наследия белорусов; расширено поле исследований белорусской фольклористики в результате введения в научный оборот новых аутентичных текстов. Описана история изучения военного фольклора с учетом исторических, социокультурных и идеологических факторов влияния; определено значение метода социалистического реализма для белорусской фольклористики 1930–1980-х гг. Впервые на материале наиболее репрезентативных песенных текстов разработана концепция фольклоризации как способа усвоения устной народной традицией нового художественного содержания. Раскрывается жанровая специфика и мифосемантика явлений военного фольклора, ранее остававшихся на периферии научной рефлексии (военные песни, исторические предания, герменевтические формы народной прозы, обрядовые практики).

**Рекомендации по использованию**. Теоретические положения и текстовый материал диссертации могут выступать теоретико-методологической и фактической базой при дальнейшей разработке ряда проблем фольклористики, истории белорусской науки XX в., составлении справочников и энциклопедий. Результаты диссертации могут быть внедрены в учебный процесс по гуманитарных дисциплинам в высшей школе.

**Область применения**. Фольклористика, история Беларуси, культурология.

# SUMMARY

Nastassia A. Sheiback

**Belarusian Military Folklore of the 20th century: Evolution, Mythosemantics, and the Specifics of Artistic Discourse**

**Key words:** Belarusian military folklore, folkloristics, folklorisation, mythosemantics, artistic discourse, socialist realism, historicism, ritual practice, motif, plot.

**The purpose of the study** is to determine the socio-historical nature and ideological and artistic content of Belarusian military folklore of the twentieth century.

The complex approach to the study of the stated problem determined the **methodology of the research,** which is based on historical-genetic, chronological, cultural-historical, structural-semiotic methods in combination with folkloristic, contextual and discursive analysis of the traditional text.

**Outcomes and novelty.** For the first time the development and ideological and artistic nature of the military folklore of the 20th century as a part of the ethno-cultural heritage of the Belarusians are investigated; the field of research of Belarusian folkloristics is expanded as a result of the introduction of new authentic texts into the scientific turnover. The history of the study of military folklore is described, taking into account historical, socio-cultural and ideological factors of influence; the significance of the method of socialist realism for Belarusian folkloristics in the 1930s-1980s is determined. For the first time the concept of folklorisation as a way of assimilating new artistic content into the oral folk tradition is developed on the material of the most representative song texts. The genre specificity and mythosemantics of the phenomena of military folklore, which previously remained on the periphery of scientific reflection (military songs, historical legends, hermeneutic forms of folk prose, ritual practices), are revealed.

**Recommendations for usage.** The theoretical provisions and textual material of the dissertation can be used in the further development of the problems of folkloristics, the history of Belarusian science of the twentieth century, the compilation of reference books and encyclopaedias. The results of the dissertation can be introduced into the educational process of humanities disciplines in higher school.

**Applicable scope.** Folkloristics, History of Belarus, Cultural studies.

Падпісана да друку 16.04.2025. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 2,56. Ул.-выд. арк. 2,75.
Тыраж 70 экз. Заказ 60.

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка
ў рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/63 от 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.